Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

КОШТ НУМАРУ 5 кап.

Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Натар'ат прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.
Невыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не вяртаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА:

На 1 месяц	— 90 к.
„ 3 „	2 р. 70 к.
„ 6 „	4 р. — к.
„ 1 год	8 р. — к.
Зьмена адрасу: Інгагародзія	— 20 к.
мясцовая	— 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ:

За радок шапарэлі пасьля тэксту — р. 50 к.
За радок шапарэлі паперад тэксту 1 р. — к.
За радок шапарэлі перад тэкстам 1 р. 50 к.
Скідкі на 50 проц. дазволены.
Зьмена тарыфу бярэцца 10 проц. налогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ:

За 1 дакумант . . . 35 кап.
За кожны дадатковы . . 15 „
Беспрацоўн. і чырвонаармейцы за дакумант . . 15 „
За кожны дадатковы . . 5 „
Публікацыі ЗАГС'у—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газэты, ва ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і на ўсіх пашт.-тэл. канторах.
АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

9 ГОД ВЫДАНЬНЯ. ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. № 262 (2450) Чацьвер, 15-га лістапада 1928 г.

19 лістапада а 10 гадзіне раніцы, у залі пасяджэньняў Прэзыдыуму ЦВК адбудзецца пасяджэньне камісіі па падрыхтоўцы сьвяткаваньня дзесяцігодзьдзя агалашэньня БССР.

ПАРАДАК ДНЮ НАСТУПНЫ:

1. Даклад аб праведзеных па лініі каапэрацыйных арганізацый мерапрыёмствах па падрыхтоўцы сьвяткаваньня дзесяцігодзьдзя агалашэньня БССР.—Дакладчыкі т. т. Наўлянскі і Аксючыц.

2. Даклад аб падрыхтоўцы арганізацый моладзі да сьвяткаваньня дзесяцігодзьдзя агалашэньня БССР.—Дакладчык т. Галавач.

3. Даклад аб ажыцьцяўленьні мерапрыёмстваў культурнай рэвалюцыі ў дні сьвяткаваньня дзесяцігодзьдзя агалашэньня БССР (барацьба з алкагалізмам, хуліганствам і г. д.).—Дакладчык т. Антанікоўскі.

4. Даклад Магілёўскай акруговай камісіі аб праведзеных мерапрыёмствах па падрыхтоўцы сьвяткаваньня дзесяцігодзьдзя агалашэньня БССР.

Камісія Прэзыдыуму ЦВК БССР.

Аб узмацненьні дзейнасьці раённых, сельскіх і местачковых рэвізійных камісій.

Усім акруговым і раённым выканаўчым камітэтам.

У надыходзячую перавыбарчую кампанію сумесна з перавыбарамі саветаў будуць перавыбраны таксама і рэвізійныя камісіі.

Роля рэвізійных камісій, як органу грамадзкага кантролю, у сувязі з разьвіцьцём гаспадаркі раённых выканаўчых камітэтаў, узростам іх бюджэту, а таксама і ўзмацненьнем мізаных саветаў і пашырэньнем кольнасьці сельскіх саветаў, маючых свой самастойны бюджэт, усё больш павялічваецца. Рэвізійныя камісіі павінны па сваёй сутнасьці прыняць вельмі актыўны ўдзел ва ўпарадкаваньні фінансава-гаспадарчай дзейнасьці раённых выканаўчых камітэтаў і сельскіх і местачковых саветаў. Асаблівую ўвагу рэвізійныя камісіі павінны зьвяртаць на правільнае і па прызначэньні скарыстаньне сродкаў, атрыманых шляхам самаабкладаньня.

Правы рэвізійных камісій у сучасны момант пашыраны. 27-га кастрычніка 1928 году Прэзыдыум ЦВК БССР даў права раённым рэвізійным камісіям правяраць выкананьне пастаноў раённых зьездаў саветаў і сельскім і местачковым рэвізійным камісіям—правяраць выкананьне саветамі наказаў выбаршчыкаў.

Усё гэта прымушае пастаяць рэвізійныя камісіі ў такія ўмовы працы, пры якіх яны змогуць пасьпахова вырашаць пастаўленыя перад імі задачы.

Сучасная работа рэвізійных камісій адзначаецца іх маладзейнасьцю. Тыя камісіі, якія антыўна працуюць, абмяжоўваюцца пераважна гатоўкі кас, не ўваходзячы ў ацэнку правільнасьці выкананьня бюджэту. Справаздачы рэвізійных камісій перад выбаршчыкамі практыкуюцца не заўсёды і звычайна носяць выпадковы характар.

Праца рэвізійных камісій вымагае ад іх членаў шэраг патрабаваньняў дзелавога характару. Пры выбарах рэвізійных камісій на гэты бок звычайна не зьвяртаецца належная ўвага. На прадвыбарчых сходах кандыдатуры не абгаворваюцца, выбаршчыкі не азнаёмляюцца з задачамі і мэтамі рэвізійных камісій. Гэта трэба ўлічыць і падрыхтаваць адпаведныя кандыдатуры ў рэвізійныя камісіі. Такім чынам, будзе забясьпечан склад гэтых камісій працаздольнымі і ведуючымі гэту работу работнікамі, дзякуючы чаму рэвізійныя камісіі стануць аўтарытэтнымі органамі сапраўднай праверкі фінансава-гаспадарчай дзейнасьці нізавога савецкага апарату.

Пасьпяховая дзейнасьць рэвізійных камісій залежыць у значнай ступені яшчэ ад ступені [овдзейнічаньня і дапамогі ім з боку вышэйстаячых выканаўчых камітэтаў. Апроч гэтага, рэвізійныя камісіі, на шаючы новыкаў у кантрольнай работе, адчуваюць патрэбу ў тэхнічнай дапамозе, якую ім могуць і павінны аказаць органы дзяржаўнага фінансавага кантролю. З гэтае прычыны рэвізійныя камісіі павінны падтрымліваць з імі шчыльную сувязь. Асабліва важна наладзіць тэхнічную дапамогу з боку органаў фінансавага кантролю ў галіне рэвізіі бюджэтнай працы саветаў і РВК.

Паводле выкладзенага, Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР прапануе акруговым выканаўчым камітэтам ужыць неабходныя мерапрыёмствы, якія забясьпечылі:

1. Папярэднее абмеркаваньне выбаршчыкамі кандыдатур у рэвізійныя камісіі і выбары ў склад рэвізійных камісій асоб, здольных працаваць у галіне [кантрольнай работы.

2. Азнаямленьне выбаршчыкаў з задачамі і мэтамі рэвізійных камісій.

3. Абавязковую справаздачнасьць раённых рэвізійных камісій на раённых зьездах саветаў і справаздачнасьць сельскіх і местачковых саветаў на прадвыбарчых сходах.

4. Дапамогу рэвізійным камісіям у іх працы і інструктаваньне з боку вышэйстаячых выканаўчых камітэтаў.

5. Шчыльную сувязь рэвізійных камісій з органамі фінансавага кантролю ў мэтах вывучэньня тэхнічнага боку кантрольнай работы.

6. Шчыльную сувязь з гарадзкімі органамі.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. ЧАРВЯКОЎ.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. ХАЦКЕВІЧ.

Трэба падцянуцца ў шэфпрацы.

МАСКВА, 13-XI. У пастанове аддзелу ЦК па працы на вёсцы і центральнае шэфкамісіі між іншым гаворыцца: «Аддзел ЦК УсеКП(б) аб працы на вёсцы і центральная шэфкамісія сьцьвярджаюць значны заняпад працы шэфскіх арганізацый за апошнія паўтара-два гады, і ў выніку—зьмяншэньне палітычнае ролі рабочага шэфства, як правадніка камуністычных ідэй і сацыялістычнага арганізатара вёскі. Належыць падкрэсьліць, што якраз зараз, калі рабочая кляса шчыльна падышла да ажыцьцяўленьня задач сацыялістычнае перабудовы вёскі ў перыяд абвастрэньня клясавае барацьбы, праца шэфскіх таварыстваў, як арганізацый рабочых мас, набывае асабліва важнае палітычнае значэньне. Трэба дамагчыся рашучага пералому ў справе ўцягваньня шырокіх мас рабочых у шэфскую працу, абапяршіўшы рашучую барацьбу з нагледаемай бюракратызацыяй шэфскіх таварыстваў. Шэфская арганізацыя павінна будаваць свой план на аснове веданьня канкрэтных умоў раёну, і абавязкова пагоджваць сваю працу з планам мясцовых кіраўніх партыйных і савецкіх арганізацый.

Пастанова зварочвае ўвагу фабрычна-заводзкіх арганізацый, што іх абавязак—ужыць захады, каб узмацніць непасрэдную сувязь і палітычны ўплыў на абкружаючыя іх сялянскія масы. Трэба куды шырэй разгарнуць больш актыўную працу па арганізацыі зямлецтваў, якія дакавалі карысьнасьць гэтае формы арганізацыі шэфскае працы.

Задачы вытворчага каапэраваньня, калектывізацыі, уздыму культурнага ўзроўню сялянскіх мас і адпору на наступ капіталістычных элементаў вёскі, падкрэсьленыя 15-м зьездам, як асноўныя задачы ўсяе вясковае працы, павінны быць такімі і для ўсяе працы шэфаў. Каапэратыў, савгас, школа, лікпункты, хата-чытальня павінны стаць у центры ўвагі працы на вёсцы. Дапамагаючы ўсямерна арганізацыям па выхаваньні батрацкіх і бядняцка-сярэдняцкіх мас, засноўваючы непасрэдную сувязь з групамі бедноты і арганізацыямі батрацтва, дапамагаючы працы делегацкіх сходаў сялянак, яны павінны супольна з партыйнымі ячэйкамі стаць арганізатарам самакрытыкі проці бюракратычных скажэньняў, выкрыўленьня партлініі на вёсцы і застрэльшчыкам у барацьбе з кулацтвам. На аснове разгортваньня гэтае самакрытыкі і росту самадзейнасьці сялянскіх мас шэф-арганізацыі дапамагаюць ачыстцы апарату ад сацыяльна чужых (кулацкіх) нягодных элементаў, ужываючы шмат захадаў да вадрыхтоўкі і вылучэньня ў савецкі каапэратыўны апарат новых кадраў, у першую чаргу, з батрацкага бядняцкага актыву. Разам з тым шэфскія арганізацыі падрыхтоўваюць з сваіх кадраў таварышоў для пасылкі на вёску ў якасьці сталых працаўнікоў нізавога савецкага апарату. Для гэтае мэты шэфскія арганізацыі павінны ўзяць самы энэргічны ўдзел у управядзеньні кампаніі перавыбараў сельсаветаў.

Лічачы зусім недапусьцімаю практыку пасылкі, а іншы раз проста зьняважлівых адносін да шэфства з боку прафсаюзаў, аддзел ЦК па працы на вёсцы патрабуе ад фракцый усіх прафсаюзных арганізацый усямернае дапамогі на разьвіцьцю шэфскае працы, між іншым, лічачы матавгодным абмеркаваць пытаньні шэфства на надыходзячых губэрскіх і вобласных канфэрэнцыях прафсаюзаў. Трэба таксама ўжыць захады, каб узмацніць працу камсамольскіх арганізацый у шэфскіх таварыствах. Неабходна, каб друк шырэй папулярызаваў ідэі шэфства і асьвятляў яго практыку ў разрэзе агульных задач рабочае клясы ў адносінах да вёскі. Дзеля ўзмацненьня фінансавае базы шэфскіх арганізацый дазваляецца практыкаваць дабраахвотныя работы, а таксама суботнікі на карысьць шэфскае арганізацыі.

Самакрытыка аздаравіла прафарганізацыі Украіны.

ХАРКАЎ, 12-XI. У гутарцы з супрацоўнікам РАТАУ наконт ажыцьцяўленьня лёзунгаў самакрытыкі ў прафесыянальных арганізацыях загадчык арганізацыйнага аддзелу Усеукраінскага ЦСПС тав. Каранеўскі паведаміў наступнае:

Самакрытыка спрыяла росту актыўнасьці шырокіх рабочых мас, выяўленьню шмат-якіх хваравітых зьявішчаў у прафарганізацыях. За апошні час на Украіне распушчаны і дачасна перавыбраны кіруючыя органы 91 арганізацыі.

Аднак, ніводнага разу роспуск ці дачасныя перавыбары не адбыліся ў выніку ініцыятывы зьнізу. Рабочая маса часта баіцца крытыкаваць недахопы. Бясспрэчна, факты зажыму за самакрытыку сапраўды ёсьць. У далейшым усе прафарганізацыі, асабліва нізавыя, павінны шырока разгарнуць працу ў галіне растлумачэньня лёзунгаў самакрытыкі непасрэдна ў цэхах.

Месца прафсаюзаў—у авангардзе выбарчага фронту.

Дапамагчы батрацкім і бядняцкім гушчам вёскі ў барацьбе проці кулака, папа і бюракрата—вось адна з асноўных задач арганізаванага пралетарыяту ў часе перавыбараў у саветы.

Ліст УЦСПС да ўсіх прафарганізацый.

МАСКВА. Ліст УЦСПС да ўсіх прафесыянальных арганізацый аб удзеле прафсаюзаў у кампаніі перавыбараў саветаў.

Барацьба рабочае клясы і яго арганізацый з варожымі справе сацыялізму сіламі, як і ўся справа сацыялістычнага будаўніцтва, шмат у чым залежыць ад працы дзяржаўнага апарату, ад яго дасягненьняў і недахопаў. Вось чаму барацьба за аздараўленьне і узмацненьне апарату, за яго патаненьне, за ачыстку яго ад бюракратаў і чыноўніцтва, за палепшаньне яго працы вылучаецца самаю галоўнаю чарговаю задачаю рабочае клясы.

Непарыўнасьць інтарэсаў эканамічных арганізацый пралетарыяту—прафсаюзаў—і органаў яго дзяржаўнае ўлады—саветаў—пад вялікім агульным кіраўніцтвам партыі пралетарыяту — УсеКП(б), — вось у чым асноўная ідэя, якою павінна быць прасякнута прапаганда і агітацыя прафсаюзаў СССР у часе кампаніі па перавыбарах саветаў.

Трэба загадзя і ўсебакова расталмачыць шырокім масам сяброў прафсаюзаў іх непасрэдную зацікаўленасьць у палепшаньні працы саветаў і выплываючую адтэуль патрэбу актыўнага ўдзелу ў надыходзячых перавыбарах саветаў. Павінны быць ужыты ўсе захады да своечаснае арганізацыйнае і агітацыйна-прапагандысцкае падрыхтоўкі шырокіх рабочых мас. Саюзныя арганізацыі на мясцох павінны быць разгружаны ад правядзеньня ў гэты час іншых кампаній. Трэба поруч з агульнымі вуснымі справаздачамі, максымальна гладкімі і канкрэтнымі, ставіць на сходах даклады дэпутатаў у савеце ад данага прадпрыёмства, цэху, зьмены аб іх працы ў саветах і выкананьні саветамі як усяго наказу, так і асабліва дадатковаў да яго, [illegible]валеных на даным прадпрыёмстве, цэху, зьмене пры мінулых выбарах у саветы. На буйных прадпрыёмствах трэба праводзіць як абмеркаваньне справаздач дэпутатаў, так і папярэдняе абмеркаваньне і вылучэньне кандыдатур дэпутатаў у савет,—усё гэта павінна непасрэдна на цэхавых і зьменавых сходах у тых выпадках, калі ў цэху ці зьмене працуе належны для выбараў лік рабочых. Увесь наяўны прафактыў павінен быць, на магчымасьці, прыцягнут да непасрэднага ўдзелу ў справаздачных і выбарчых сходах. У склад саветаў трэба высоўваць ня толькі актыўных дэпутатаў саветаў мінулага скліку, але і, пераважна, новыя кандыдатуры рабочых, якія карыстаюцца аўтарытэтам і давер'ем сярод рабочых.

Фабрычна-заводзкія і мясцовыя камітэты павінны ўстанавіць нагляд, каб дэпутаты, сябры савету ад „данага прадпрыёмства, установы, цэху, зьмены своечасна інфармавалі сваіх выбаршчыкаў аб усіх важных пастановах савету. Прафесыянальныя органы і, асабліва, фабрычна-заводзкія і мясцовыя камітэты, павінны ўважліва сачыць, каб дэпутаты перыядычна правералі выкананьне саветамі наказаў, асабліва ў частцы, якая датычыць данага прадпрыёмства.

Трэба пераглядзець нагрузку сяброў саветаў прафсаюзнымі і грамадзкімі абавязкамі, каб яны мелі магчымасьць браць актыўны ўдзел у працы савету. Дэпутаты павінны даваць справаздачы аб сваёй дзейнасьці перад выбаршчыкамі ня менш двух разоў за год.

Складанасьць палітычных варункаў на вёсцы, няўхільнае абвастрэньне клясавае барацьбы наваколо выбараў у саветы ўзьнімае перад прафсаюзамі задачу зьвярнуць асаблівую ўвагу на ход выбараў у саветы на вёсцы. Прафсаюзы павінны зьвярнуць самую сур'ёзную ўвагу на ўцягваньне ў надыходзячую кампанію выбараў у саветы шырокіх гушчаў рабочых вёскі, арганізаваных у прафсаюзы,—батракоў, пастухоў, рабочых савецкіх гаспадарак, сэзонных рабочых, у савгасах (будаўнікоў, тарфянікаў), кастаўнікаў, аграномаў, земляўпарадкавацеляў і г. д., каб у працэсе выбараў у саветы на вёсцы палітычна адмежаваць кулацтва, згуртаваць наваколо саветаў шырокі батрацкі і бядняцкі актыў. Задача прамысловых рабочых і іх саюзаў—дапамагчы ў барацьбе батрацкіх і бядняцкіх гушчаў на вёсцы, дапамагчы ім павесьці за сабою сярэдняка проці кулака, проці папа, проці бюракрата і тым самым забясьпечыць моцны саюз пралетарыяту гораду з асноўнымі працоўнымі масамі вёскі.

У надыходзячую выбарчую кампанію прафсаюзы павінны дэлегаваць актыўных працаўнікоў індустрыяльных саюзаў для правядзеньня выбараў на вёсцы.

13-ты дзень рурскага лёкауту.

УРАД АДКРЫТА СТАЎ НА БОК ФАБРЫКАНТАЎ. КАМФРАКЦЫЯ РЭЙХСТАГУ ВЫКРЫВАЕ САЦЫЯЛ-ШТРЭЙКБРЭХЕРАЎ.

БЭРЛІН, 13-IX. Спрэчкі ў рэйхстазе аб лёкауце распачаў міністр працы Вісэль. Цалком стаўшы на т. зв. «юрыдычны пункт гледжаньня», міністр самым шырокім парадкам пашоў насустрэч інтарэсам прадпрыёмцаў. Адзіным выхадам з становішча, які ўнясе спакой ва ўсю гаспадарку ў цэлым, Вісэль лічыць кампраміс.

Выступіўшы ў спрэчках камуністычны дэпутат ад Рурскае вобласьці Флёрын падкрэсьліў, што барацьба вядзецца не па юрыдычнай, а на палітычнай падставе. Ён зазначыў на вялізныя прыбыткі рурскіх прамыслоўцаў, на рост прадукцыі, які дасягнецца за кошт рабочых у выніку нячуванае эксплёатацыі, і назваў хлусьнёю заявы прадпрыёмцаў, нібы яны ня могуць вытрымаць павышэньня заработку. Флёрын даводзіў, што сацыял-дэмакраты хлусяць, заявляючы, што выступленьне прадпрыёмцаў накіравана проці дзяржавы і проці існуючае працэдуры трацейскага разгляду, бо ўся дзяржава і ўвесь апарат трацейскага разгляду працуе поруч з прадпрыёмцамі. Сацыял-дэмакратычныя начальнікі паліцыі, як зазначыў далей Флёрын, выступаюць проці рабочых. Потым Флёрын востра ганьбіў паводзіны рэфармісцкіх і каталіцкіх (далучаных да партыі цэнтру) прафсаюзаў, якія арганізуюць штрэйкбрэхерства.

Скліканы кампартыяй у Берліне масавы сход рабочых пастанавіў заклікаць увесь берлінскі пралетарыят да адзіку аднагадзіннага заработку ў карысьць лёкаўтаваных.

Харчовыя пункты Міжрабпому.

БЭРЛІН, 13-XI. Міжрабпом адчыніў у Бохуме пункты харчаваньня на 800 чалавек, у Франгаўзэне—на 500, у Альтэндорфе—на 400. У Мюльгейме ўлада не дазволіла адчыніць харчоўныя пункты, і Міжрабпом абмяжуецца там выдачай харчовых пакетаў. Аўтакадённа чырвонага саюзу франтамікоў дапамагае разьмяркоўваць сабраныя па ўсёй вобласьці прадукты.

Дэманстрацыі пад кіраўніцтвам кампартыі.

БЭРЛІН, 13-XI. Пасьля таго, як стаў вядомым прысуд дуісбурскага працоўнага суду, які прызнаў трацейскую пастанову несапраўднай і, такім парадкам, стварыў бездагаворнае становішча, лёкаўтаваныя рабочыя наладзілі пад кіраўніцтвам камуністаў у шмат якіх гарадох дэманстрацыі. Тры саюзы рабочых металёўцаў заявілі, што абскарджаць гэты прысуд у агульна-нямецкі працоўны суд.

«Рота Фанэ» выкрывае закулісныя перамовы кіраўнікоў саюзу мэталёўцаў і каталіцкіх прафсаюзаў з кіруючымі прамыслоўцамі.

У Саюзе ССР.

КРЭДЫТЫ КЁНІГЗБЭРСКАГА БАНКУ ДЛЯ СССР.

БЭРЛІН, 13-11. Кёнігзбэрскі гарадзкі банк падпісаў з кёнігзбэрскім аддзяленьнем савецкага гандлёвага прадстаўніцтва згоду наконт наданьня крэдытаў для фінансаваньня вывазу сельска-гаспадарчых прадуктаў з СССР праз Кёнігзбэрг. Умоваю крэдытаваньня зьяўляецца вываз праз кёнігзбэрскі порт такога-ж ліку гэтых прадуктаў, як і летась.

Праэкт Сталінстрою.

МАСКВА, 13-11. Прэзыдыум ВСНГ СССР падаў на зацьверджаньне Савету Працы і Абароны праэкт пабудовы ў Сталінградзе (для абслугоўваньня прамысловага райёну) новае райённае электрастанцыі магутнасьцю першае чаргі ў 44 тысячы кілёват. Будаваньне станцыі павінна распачацца ў 1928 29 г., а ўся праца першае чаргі разам з электрапередачамі будзе скончана да 1931 году. Агульны кошт электрастанцыі першае чаргі складзе 17.700.000 рублёў.

Пасьпешны ход збожжазагатовак.

МАСКВА, 13-XI. За другую пяцідзёўку лістапада сыстэмай Хлебацэнтру загатоўлена 78.378 тон збожжапрадукту, што дае ў параўнаньні з леташнім другой пяцідзёўкай лістапада павялічэньне загатовак на 667,2 проц.

Загатавана: пшаніцы—36.453 тоны, жыта—4331 тона, аўса—11.078 тон, ячменю—1.331 тон, кукурузы—3.295 тон, масьлічных культур—17.018 тон і іншых культур 4.822 тоны.

Усяго за першую дзесяцідзёўку лістапада сыстэмай Хлебацэнтру загатавана 159 336 тон, што складае 29,4 проц. выканьня плянавых заданьняў саюзнага НК гандлю на лістапад месяц г. г.

Крым ачуньвае ад насьледкаў землядрыгу.

17 МІЛІЁНАЎ НА АДНАЎЛЕНЬНЕ ЗРУЙНАВАНАГА.

МАСКВА, 10-XI. СНК РСФСР абмеркаваў паведамленьне ўраду крымскае рэспублікі наконт ходу аднаўленьня Крыму пасьля землядрыгу.

На аднаўленьне будаўніцтва разам з падачаю першачарговае дапамогі было выдадзена больш 10-міліённаў рублёў. Галоўныя работы на аднаўленьні выкананы на 15-га верасьня ў разьмеры 90 проц. Ёсьць усе падставы спадзявацца, што ў сёлетнім будаўнічым сэзоне будзе палкам выкаван увесь будаўнічы план. У 1928-29 г. на рамонтна-аднаўленчую працу ў Ялце, Севастопалі, Бахчы-Сараі, Кара-Субаі, Судаку, Феадосіі, Джанкоі і Сімферопалі мяркуецца затраціць яшчэ блізка 7-мі міліённаў руб.

СНК даручыў спэцыяльнай камісіі разглядзець пытаньне аб дапамозе Крымскай рэспубліцы ў 1928-29 г. на далейшую працу па ліквідацыі выніку землядрыгу. Гэтай самай камісіі даручана абмеркаваць пытаньне наконт авансу, патрэбнага крымскаму ўраду на загатоўку будаўнічага матар'ялу да надыходзячага сэзону.

Царкоўны хлам на патрэбы прамысловасьці.

ІВАНА-ВАЗЬНЯСЕНСК, 14-XI. Сяляне шмат якіх вёсак Інешанскага павету аддаюць на патрэбы прамысловасьці медныя званы з царквы.

На мэталёвыя заводы пасланa ўжо блізка 4-х тон медзі ад званоў і царкоўнага начыньня.

Аднаўленьне А. Д. Саркіса ў члены партыі.

МАСКВА. Парткалегія ЦКБ УсеКП(б) ухваліла 9-га лістапада такую пастанову: «Бяручы пад увагу, што Саркіс А. Д. зрабіў заяву, у якой прызнаў свае прынцыповыя памылкі, адмежаваўся ад плятформы трацкістаў, зганьбіў фракцыйную дзейнасьць трацкісцкае апазіцыі, спыніў гэтую дзейнасьць і заявіў аб поўным падначаленьні ўсім пастановам УсеКП(б) і Камінтэрну,—аднавіць яго ў правах УсеКП(б), занатаваўшы ў асабовай справе і партыйным білеце перарыў яго пабыту ў партыі з часу выключэньня да 9-га лістапада 1928 г.

Стан жаночага беспрацоўя.

МАСКВА. НК Працы СССР падсумаваў выніні беспрацоўя сярод жанчын у СССР.

За апошніх 2 гады лік беспрацоўных жанчын павялічыўся на 80 тысяч (на 1-га кастрычніка 1926 г. было 520 тысяч, а ў верасьні 1928 г.—600 тысяч), не зважаючы на нясупынны рост жаночае працы ў прамысловасьці. Поруч з агульнымі прычынамі, беспрацоўе сярод жанчын выклікаецца і некаторымі спэцыфічнымі бытавымі ўмовамі, між іншым, ростам культурнага ўзроўню жанчын і іх імкненьнем да самастойнасьці. На біржах працы заўважана значная прапанова працы в боку такіх членаў сям'і працоўных, якія ў мінулыя гады па найме не прапавалі.

4 новыя лесавозы.

ЛЕНІНГРАД, 12-XI. На Балтыцкім суднабудаўнічым заводзе распачата пабудова 4-х новых лесавозаў (4-е серыі). Гэтыя судны будуць мець грузаўздымнасьць па 3 з паловаю тысячы тон кожнае. Яны прызначаюцца для перавозкі лесу заграніцу з Ленінграду і партоў Белага мора.

Як выканан дзяржбюджэт за 2 гады.

(*На пленуме бюджэтнае камісіі ЦВК СССР*).

МАСКВА. 13-га лістапада пад старшынствам т. Шмідта пачаўся пленум бюджэтнае камісіі ЦВК Саюзу ССР. На парадку дню пленуму—справаздача аб выкананьні бюджэту за 1926-27 год і даклад ураду аб бюджэце на 1928-29 год.

З дакладам аб выкананьні бюджэту 1926-27 г. выступіў т. Вайнштэйн. Ён зазначыў, што агульныя вынікі выкананьня гэтага бюджэту спрыяючыя. Упершыню отворан запас у суме 100 міліённаў рублёў. Бюджэт у цэлым даў астачу вольных сродкаў у 52 міліёны рублёў. У прыбытковай частцы ёсьць у процівагу мерканьням лішні выплат у 230 міліённаў рублёў. Прырост бюджэту ў 1926-27 годзе ў параўнаньні з 1925-26 г. складае 33 проц.

Вынікі выкананьня бюджэту 1927-28 г., водлуг папярэдніх даных, таксама спрыяючыя: складзен запас у 50 міліённаў рублёў, ёсьць астача прыблізна ў 111—112 міліённаў, якая ўжо залічана ў прыбытковую частку бюджэту 1928-29 году; ёсьць таксама перавышэньне прыбыткаў над выдаткамі ў параўнаньні з меркаваньнямі, прыблізна на 300 міліённаў рублёў. РОСТ БЮДЖЭТУ 1927-28 г. ПРОЦІ 1926-27 г. СКЛАДАЕ 20,4 ПРОЦ. Такім парадкам, мы маем за апошніх 2 гады вельмі спрыяючае выкананьне бюджэту.

Пераходзячы да характарыстыкі выдаткоўнае часткі бюджэту 1926-27 году, дакладчык зазначае, што прырост прыбыткаў, які складае ў параўнаньні з папярэднім годам 1.268 міліённаў рублёў, быў затрачан так: 28,4 проц. на патрэбы народнае гаспадаркі, 33,1 проц. на транспарт і сувязь і блізка 13-ці проц. перададзена ў мясцовы бюджэт. Такім парадкам, блізка трох чвэртак гэтага прыросту было выдадзена на далейшае разьвіцьцё народнае гаспадаркі і на дапамогу мясцоваму бюджэту. Прыблізна такім самым зьяўляецца характар выдаткаў прыр оту бюджэту і за 1927-28 г. Пасьля дакладу т. Вайнштэйна і саданаладу т. Всташкіна адбыліся спрэчкі. Гэтым і скончылася праца першага дню пленуму бюджэтнае камісіі.

АМЭРЫКАНСКІ ПЛЯН МАРСКІХ УЗБРОЕНЬНЯЎ.

ВАШЫНГТОН, 13-XI. Пасьля выступленьня Куліджа, прамова якога адбіла тэндэнцыі эканамічнае і вайсковае палітыкі Амэрыкі, марское міністэрства таксама выступіла з паведамленьнем, у якім заяўляе, што яно імкнецца мець флёт—які „не саступай-бы ніякаму іншаму". Мэта, якая ставіцца пры гэтым, грунтуецца, водлуг слоў марскога міністэрства, на тым, каб „падтрымліваць гандлёвую палітыку Штатаў і ахоўваць кантынэнтальныя і заморскія ўладаньні Амэрыкі».

Далей у паведамленьні зазначана, што ўсе баявыя судны будуць пабудаваны на аснове прапорцыі 5:3, устаноўленай Вашынгтонскай канфэрэнцыяй для капітальных суднаў. Марское міністэрства мае на мэце пабудову суднаў выключна ў 10 тысяч тон, узброеных 8-міліёвымі гарматамі, прычым марское міністэрства маркуе замяніць усе старыя крэйсэры. Апроч таго, марское міністэрства дамагаецца разьвіцьця цывільна-марское авіацыі і павялічэньня ліку лёгкіх і цяжкіх самалётаў, якія будуць спрыяць ваєнна-марскім апэрацыям. Плян, распрацаваны марскім міністэрствам, прадугледжвае разьвіцьцё марскіх баз на Гавайскіх выспах, Панаме, на Ціхаакіянскім узьбярэжжы і пабудову новае марское базы ў Сан-Францыска. Плян прадугледжвае яшчэ разьвіцьцё шляхаў зносін «в мэтаю забясьпечыць інтарэсы Амэрыкі ў галіне зносін».

Замах правых на аўстрыйскую канстытуцыю.

САЦЫЯЛ-БАУЭРАЎЦЫ ЗУСІМ ЗАБЛЫТАЛІСЯ.

ВЕНА, 13-XI. Ангельскае тэлеграфнае агенцтва паведамляе: «Сёньня на пасяджэньні парляманцкае рады старэйшыны канцлер Зэйпель падаў прапанову, каб прадоўжыць на некаторы час у законадаўчым парадку паўнамоцтвы цяперашняга аўстрыйскага прэзыдэнта Хайніша ў зьвязку з давер'ем, якім ён карыстаецца сярод жыхарства; за гэты час павінна быць праведзена зьмена канстытуцыі, у моц якое, згодна жаданьню шырокіх колаў жыхарства, прэзыдэнт павінен абірацца непасрэдна жыхарствам, а адначасна павінны быць пашыраны яго паўнамоцтвы ў пытаньнях назначэньня ўраду і роспуску нацыянальнае рады.

Ад імя сацыял-дэмакратаў венскі бургамістр Зэйц заявіў, што сацыял-дэмакратычная партыя выказваецца прынцыпова проці непасрэднага абраньня прэзыдэнта жыхарствам, [ачыны ў гэтым небясьпеку для дэмакратыі. Узьнятыя канцлерам пытаньні, Зэйц, як ён заяўляе, падасьць на разгляд сацыял-дэмакратычнае фракцыі.

УВАГА: тэрмін паўнамоцтваў сучаснага аўстрыйскага прэзыдэнта Хайніша скончыцца 6-га зьнежня. Водлуг цяперашняе аўстрыйскае канстытуцыі, прэзыдэнт абіраецца на супольным пасяджэньні абедзьвюх палат парляманту, г. зн. нацыянальнае рады і саюзнае рады, на 4 гады. Урад абіраецца нацыянальнаю радаю. Нацыянальная рада можа быць распушчана толькі згодна на ўласнае пастановы.

ЧЫГУНАЧНІКІ-КАМУНІСТЫ ЧЭХАСЛАВАКІІ ЗВАЛЬНЯЮЦЦА З ПРАЦЫ.

ПРАГА, 13-XI. Газэта «Чэшска Слово» паведамляе, што зараз на ўсіх чыгунках Чэха-Славакіі звальняюць штатных і паза-штатных чыгуначнікаў, западозраных у камунізьме. Пакідаюцца толькі служачыя, якія заявілі аб выхадзе з партыі, але нават такія заявы ня прыймаюцца пад увагу, калі прозьвішчы заяўляючых былі ў свой час у камуністычных сьпісах пры выбарах у камітэты чыгуначнікаў.

Палітычна-гаспадарчы крызіс у Латвіі.

АДСТАЎКА ЎРАДУ.

РЭВЕЛЬ, 13-XI. Пасьля адчыненьня пасяджэньня парляманту, старшыня пасяджэньня агаласіў ліст кіраўніка ўраду Дэнісона аб адстаўцы ўраду.

Урадавы крызіс выклікан пазыцыяй аграрыяў.

МЕНШАВІКАМ НЕ ЎДАЛОСЯ СКЛАСЬЦІ ЎРАД.

РЫГА, 13-XI. Сацыял-дэмакраты адмовіліся скласьці ўрад.

Лідэр сацыял-дэмакратычнае фракцыі, ранейшы міністр замежных спраў Цялене, у гутарцы з карэспандэнтам ТАСС заявіў: «Адмова выкліканa тым, што некаторыя цэнтрысцкія партыі, згаджаючыся ў прынцыпе на ўдзел у левай каліцыі, патрабуюць, аднак, суп'ізнае зьмены сацыял-дэмакратычнае плятформы ў пытаньнях спэцыяльнага заканадаўства, амністыі і інш».

ДЭЛЕГАЦЫЯ БЕСПРАЦОЎНЫХ У ПРЕМ'ЕРА.

РЫГА. Да латвійскага прэм'ера наведалася дэлегацыя лібаўскіх, міхаўскіх і віндаўскіх беспрацоўных, якія перадалі яму патрабаваньні беспрацоўных. Дэлегацыя, між іншым, патрабуе пашырыць транзіт на Лібаву, пашырыць гаспадарчую сувязь з СССР, а таксама падпісаць гарантыйны ўгавор з СССР. На чале дэлегацыі быў дэпутат рабоча-сялянскае фракцыі Хом Балёдыс.

ЗДАНЬ ГОЛАДУ.

РЫГА. Водлуг вестак ЦСУ, у Латвіі на 15-га кастрычніка было засеяна толькі 20 проц. усяе засеўнае плошчы пад азіміну.

ЗАМАХ НА ЦЯГНІК ПРЭЗЫДЭНТА.

РЫГА, 13-XI. Газэты паведамляюць, што ўчора пад Мітаваю ўчынен замах на цягнік прэзыдэнта. У стрэлку быў пакладзены сякера, якая, аднак, была своечасна выкрыта, а цягнік затрыманы.

ВЫЛАЗКА ПРОЦІ МАНАПОЛІІ ЗАМ. ГАНДЛЮ Ў СССР.

РЫГА, 12-XI. Орган дэмакратычнага цэнтру «Цэнтра Бале» у артыкуле наконт савецка-латвійскага гандлёвага ўгавору зазначае, што апазіцыя адмовілася [illegible]рэчыць угавору; «застаецца толькі дамагацца выгоднага для Латвіі ажыцьцяўленьня яго»—піша газэта.

Пасьля некалькіх крытычных заўваг да ўгавору газэта піша: «Каб отварыць працівагу манаполіі замежнага гандлю СССР, належала-б неадкладна заснаваць органы, наштшат камісіі, складз

У ПАНСКАЙ ПОЛЬШЧЫ

Апэляцыя ў працэсе „Грамады“.

Пшэдсьвіт (№ 34) паведамляе, што з прычыны апэляцыі 40 засуджаных у працэсе забароненай беларускай арганізацыі «Грамады» апэляцыйны суд ў Варшаве прыступіў до новага разгляду справы. Суд адбудзецца ў канцы студзеня наступнага году. Засуджаных будуць бараніць адвакаты Сьмяроўскі і Эттынгэр.

Новыя чыгункі ў Польшчы.

Міністэр шляхоў зносін распрацавала праект пабудовы новых 12 чыгунак, якія будуць мець і стратэгічнае значэньне. Дарогі будуць пабудаваны між Варшаваю, Львовам, Кракавым, Астраленкаю і Млавою.

Арышты ў Новым Сончу:

«Газ. Варш.» (№ 338) паведамляе, што ў Новым Сончу арыштаваны 36 асоб быццам за камуністычную дзейнасьць, а ў прыватнасьці за прыналежнасьць да кампартыі, Мопру, к-ту дапамогі палітвязьням і самасаблу. Выкрыта таксама друкарня, у якой друкаваліся камуністычныя адозвы. Сярод арыштаваных знаходзяцца быццам выдатныя кам. агітатары. Арыштаваных (36 асоб) пасадзілі ў астрог у Новым Сончу.

Забойства паліцыянта.

Вечарам 10 лістапада невядомыя бандыты напалі на ксяндзоўскі дом у в. Відзішоў, Ненарэнтскай вол. У гэты час вартаўся дадому паліцыянт А. Белкінскі і вайшоў у ксяндзоўскі дом. Бандыты, убачыўшы паліцыянта, пачалі ў яго страляць. Белкінскі памёр у шпіталі. Бандыты ня выкрыты.

ПОЛЬСКАЯ БЕЛАЯ НОЧ.

Гэта была дзіўная канфэрэнцыя, якая сабралася ў нямецкім горадзе Кёнігзбэргу.

Не пасьпела яна адчыніцца, як кіраўнік польскай дэлегацыі міністр замежных спраў Залескі заявіў:

Канфэрэнцыя сарвана! Згода немагчыма! Далейшыя перамовы бескарысны! Канфэрэнцыю трэба зачыніць!

Чым-жа выклікана была нячуваная пасьпяховасьць Залескага? Чаму ён з такой гатоўнасьцю абвясьціў польска-літоўскую канфэрэнцыю сарванай?

Быць можа, гэта тлумачыцца пазыцыяй Літвы? Быць можа, літоўская дэлегацыя з самага пачатку канфэрэнцыі абвясьціла, што ні на якія ўступкі яна ня пойдзе?

Зусім не. Менавіта зараз Літва больш, чым калі-небудзь, выявіла гатоўнасьць заключыць згоду на шэрагу спрачных пытаньняў.

Як вядома, на ранейшай польска-літоўскай канфэрэнцыі Літва зрабіла досыць вялікую дыпляматычную памылку. Замест таго, каб запрапанаваць Польшчы абгаварыць практычныя пытаньні, якія датычацца становішча ў польска-літоўскай пагранічнай паласе, Літва высоўвае асноўнае пытаньне—аб захопленай палякамі Віленскай вобласьці, даючы такім чынам, прычыну абвінавачваць яе ў недамоўленасьці, у імкненьні сарваць перамовы аб заключэньні частковай згоды шляхам замены яе хворым і вострым пытаньнем аб Віленскай вобласьці. Польшча цалкам выкарыстала гэтую памылку Літвы. Яна зьвярнулася са скаргай у Лігу Нацый і знайшла там падтрыманьне супроць Літвы з боку ўсіх так званых вялікіх дзяржаў. У выніку—барацьба Літвы супроць польскіх захопніцкіх плянаў яшчэ больш ускладнілася.

На сучаснай канфэрэнцыі ў Кёнігзбэрзе Літва выправіла зробленую ёю памылку. З самага пачатку канфэрэнцыі літоўскія дэлегаты высунулі шэраг прапаноў, якія, абмінаючы пытаньне аб Віленскай вобласьці, у той самы час давалі-б магчымасьць заснаваць больш нармальныя адносіны паміж абедзьвюма дзяржавамі (як вядома, паміж Польшчай і Літвой зараз ніякіх палітычных адносін ня існуе). Літоўская дэлегацыя, папершае, згадзілася зрабіць умову аб частковым аднаўленьні зносін у пагранічнай польска-літоўскай паласе, а падругое—запрапанавала заключыць згоду аб частковым аднаўленьні гандлю паміж абедзьвюма дзяржавамі.

Чаму-ж у такім выпадку Польшча ўсё-ж такі сьпяшалася як мага хутчэй аб весьціць канфэрэнцыю сарванай? Таму, што асноўная мета Польшчы—не заключэньне міру з Літвой, а наадварот—абвастрэньне польска-літоўскіх адносін. Калі-б Польшча заключыла мірную згоду з Літвой, ажыцьцяўленьне ў будучыні польскага пляну захопу ўсёй Літвы ўжо было-б немагчыма. Наадварот, абвастрэньне польска-літоўскіх адносін толькі на руку польскай ваеншчыне, якая марыць аб пераможным паходзе проці слабой, амаль абязброенай Літвы.

Таму Польшча рознымі спробамі імкнулася сарваць канфэрэнцыю ў Кёнігзбэргу. Таму яна зараз, калі ў выніку перамоў у Кёнігзбэргу паміж Польшчай і Літвой усё-ж такі заключана згода аб частковым аднаўленьні зносін у пагранічнай паласе, яна ўсяляка імкнецца зьменшыць значэньне канфэрэнцыі. Між іншым зробленая ў Кёнігзбэргу згода мае вялікае палітычнае значэньне ўжо па аднаму таму, што гэта ёсьць першая згода паміж Польшчай і Літвой.

Разьлік Польшчы зусім ясны. Яна імкнецца ўскласьці ўсю адказнасьць за польска-літоўскі канфлікт на Літву, імкнецца паказаць справу так, як быццам ня Польшча пагражае Літве, а, наадварот, Літва пагражае Польшчы, не саромячыся непраўдзівасьці гэтага, бо Літва ў дзесяць разоў меншая за Польшчу. Польшча думае, што зьвярнуўшыся ў Лігу Нацыі з новай скаргай на Літву, яна атрымае з боку Лігі дазвол дзейнічаць проці Літвы любымі сродкамі.

Пры гэтым Польшча добра ведае, што яна мае сваіх бязумоўных прыхільнікаў у Лізе Нацый. Польская палітыка ў адносіне да Літвы цалкам падтрымліваецца Францыяй і Англіяй. Абедзьве гэтыя дзяржавы разглядаюць Літву, як шчыліну ў процісавецкім фронце, як перашкоду на шляху аб'яднаньня нашых суседзяў ад Балтыцкага мора да Чорнага ў адзін процісавецкі саюз.

Польшча можа цалкам разьлічваць на Лігу Нацый. Але ёсьць другая капіталістычная сіла, якая будзе пярэчыць ажыцьцяўленьню валяўнічых плянаў Польшчы. Гэта—Амэрыка. Не таму, зразумела, што Амэрыка вяўляецца абаронцаю малых дзяржаў нападзеных Літвы ці абаронцай справы міру. Амэрыка вядзе такую-ж імпэрыялістычную палітыку, як і іншыя буйныя капіталістычныя дзяржавы.

Але Амэрыка дала Польшчы буйную пазыку, якая гарантуецца прыбыткамі ад розных галін польскае народнае гаспадаркі. Зразумела, што ў выпадку ўзьнікненьня вайны Амэрыка пазбаўляецца сваіх гарантый. Таму Амэрыка, карыстаючыся сваімі агрэмадными фінансамі, будзе аказваць нажым на польскую палітыку, утрымліваючы яе ад спробаў запаліць пажар на Ўсходняй частцы Эўропы.

Гэтым тлумачыцца, чаму Польшча з такой трывогай і нецярплівасьцю чакае высьненьня замежных палітычных плянаў новага амэрыканскага прэзыдэнта Гувэра. Асабліва баіцца Польшча, каб Гувэр ня выказаўся ў карысьць збліжэньня Амэрыкі з СССР, не пачаў-бы падахвочваць савецка-амэрыканскі гандаль, як-бы ён у выніку ня прызнаў савецкага ўраду.

Імкнучыся да яўнага зрыву перамоў з Літвою, Польшча ў той-жа час спрабавала адыграць ролю абаронцы справы міру. Залескі меў адважнасьць заявіць літоўскім дэлегатам, што Польшча зьявілася на сэсію Лігі Нацый, калі абмяркоўвалася пытаньне аб Літве, поўная „добрых пачуцьцяў“ у адносіне да Літвы. У адказ на гэта кіраўнік літоўскай дэлегацыі Вальдэмарас заявіў:

— Мы гэта памятаем. Але яшчэ лепш мы памятаем тую белую ноч, ноч бяз сна, якую правёў Пілсудскі напярэдадні сэсіі Лігі Нацый. Тады ён вырашаў пытаньне, ці належыць яму мабілізаваць польскую армію супроць Літвы.

Апошнія перамовы ў Кёнігзбэргу паказалі, што белая ноч у польскай палітыцы ня спыняецца, што польская ваеншчына на чале з Пілсудскім чакае толькі адпаведнага моманту для ажыцьцяўленьня сваіх захопніцкіх плянаў.

ПА БЕЛАРУСКАЙ ССР.

(Ад нашых карэспандэнтаў).

ПАЖАР Ў ВІЦЕБСКІМ БЕЛАРУСКІМ ТЭАТРЫ.

ВІЦЕБСК, 14-XI. Учора а 2 з пал. гадзіне дню загарэўся будынак Беларускага Дзяржаўнага Тэатру, у якім зараз працуе Яўрэйскі Нацыянальны тэатр Беларусі (Расейская драма працуе ў гарадскім тэатры). Тэатр знаходзіцца пацярпеў ад агню. Характэрна адзначыць, што ў працягу 20 хвілін гарадзкая тэлефонная станцыя ніяк не магла злучыць тэлефон тэатру з пажарнай камандай для таго, каб выклікаць дапамогу.

Тэатр пацярпеў вялікія страты.

Абгарэла столь залі для глядачоў, а таксама частка галярэй. Тэатр быў застрахаваны на 50.000 руб., але на страхавую прэмію тэатр ня здолее хутка аднавіцца для таго, каб яўрэйскі дзяржаўны тэатр меў магчымасьць весьці далей сваю працу. У зьвязку з гэтым на пасяджэньні сэкратарыяту АВК будзе абгаварацца пытаньне аб тым, каб аказаць тэатру дадатковую дамагогу з фондаў акругі, а таксама СНК і Наркамасьветы БССР.

Дэкарацыі, гардэроб і рэквізыт не пацярпелі.

Кулак з прывілеямі.

(*Краснае, Вульскага райёну, Полаччына*).

У вялікіх лясох Полаччыны схаваўся засьценак Краснае. Прытуліўся ён цесна да цёмнага яловага лесу, каб жыць сваім старадаўнім жыцьцём воддаль ад «няпрытульнай» савецкай грамадзкасьці. Ціха і глуха ў засьценку! А гэта нуднае жыцьцё гарманіруе з кулацкім норавам.

Вось ён Логінаў Павал—«паважаная» асоба засьценка і валоліцы. Гаспадарка яго апрацоўваецца двума батракамі, сам займаецца падпольным лякарствам, а жонка трымае «вучняў» і абшывае суседнія вёскі.

Аб гэтым ведае сельсавет, але тым часам выдаюцца даведкі аб яго... беднасьці. Мала таго, у мінулым годзе Вульскі РВК пісаў паперы Глыбачанскаму таварыству аб абавязковай выдачы Логінаву Паўлу крэдыту—які і выдан у суме 420 рублёў.

А ці цікавілася ім грашовая частка РВК аб яго даходах? Логінаў за свой «выезд» да хворага менш 2 рублёў не бярэ, а якімі зямлямі ён лечыць? А ці ведае саюз рабземлес, што ў яго ёсьць батракі і як яны эксплёатуюцца?

А як будзе на адпушчаны крэдыт—420 руб. і паперку Вульскага РВК рэагаваць Полацкае РСІ?

Селянская грамадзянская думка чакае выпікаў! а... Логінава «трохі» баіцца.

Анучын Пятро.

За бязьдзейнасьць абвешчана вымова.

Віцебск, 14-XI. Кампанія па збору сельска-гаспадарчага падатку не ва ўсіх раёнах разгарнулася з аднолькавым тэмпам. Чашніцкі, Езярышчанскі, Сіроцінскі і Бешанковіцкі раёны значна адсталі ў выкананьні нават першага тэрміну збораў. Асабліва адстае Бешанковіцкі раён, дзе колькасьць неплацельшчыкаў дасягае 45 проц.

Прэзыдыум РВК ужыў цэлы шэраг захадаў у адносінах тых раёнаў, якія па нядбайнасьці сваёй зрываюць паступленьне падатку. Так, напрыклад: зьняты з працы загадчык грашовае часткі Лёзьненскага РВК Спаліс за тое, што несвасчасова разглядаў сялянскія скаргі па падатку, а таксама за неахайныя адносіны да дырэктыў вышэйшых органаў адносна рэгуляваньня сыстэмы сельска-гаспадарчага падатку; загадчыку грашовае часткі Бешанковіцкага РВК Шлявіну абвешчана вымова, а іншым раёнам зроблена папярэджаньне, што за бязьдзейнасьць яны будуць зьняты з працы.

ХЛЕБАЗАГАТОЎКІ ІДУЦЬ СЛАБА.

Магілёў, 13-XI. Нездавальняюча ідуць збожжазагатоўкі: за абедзьве дэкады кастрычніка загатоўлена жыта каля 50 процантаў месячнага пляну і яравых—якіх-небудзь 40 процантаў.

Сена-лёну загатаўліваецца наогул вельмі добра; хоць другая дзесяцідзёўка і дала зьніжэньне супроць першай, але-ж месячнае заданьне за абедзьве дэкады выканана на 180 процантаў.

Панольны збор, які таксама даў зьніжэньне ў другой дзесяцідзёўцы, усё-ж за 21 дзень кастрычніка аказаў выпаўненьне на 78 процантаў.

Савгасы і калгасы за 20 дзён кастрычніка ня выканалі і 25 процантаў месячнага заданьня.

Для ўзмацненьня загатовак трэба шырэй прасякнуць у масы, прыцягнуць кааперацыйны актыў, больш умела скарыстоўваць браніраваны і наогул тавары фонд.

НАСЕНЬНЕ—СЯЛЯНСТВУ.

Бабруйск, 14-XI. На працягу апошняга гаспадарчага году на акрузе распаўсюджана 984 тоны розных мінеральных угнаеньняў. У параўнаньні з 1926 годам, попыт на штучныя ўгнаеньні на Бабруйшчыне ўзрос на 188 проц. Попыт пераважна адчуваўся на суперфасфат.

РОСТ С.-Г. АБ'ЯДНАНЬНЯЎ.

Бабруйск, 14-XI. За час з 1 кастрычніка 1927 году па 1 кастрычніка 1928 году на Бабруйшчыне з'арганізавалася 184 новых сельска-гаспадарчых аб'яднаньняў.

Калгасаў новых з'арганізавалася 56, машынных таварыстваў—54, малочных арцелаў—23, крэдытных таварыстваў—15 і г. д.

Наогул сельска-гаспадарчая кааперацыя акругі цяпер яднае ў сабе 40561 гаспадарку.

Жанчына—старшыня РВК.

Віцебск, 14-XI. Старшынёй Езярышчанскага РВК вылучана жанчына т. Новік, якая ў апошні час загадвала нарадомам і выконвала вялікую грамадзкую працу. У гады грамадзянскай вайны т. Новік удзельнічала ў партызанскім руху, а тры гады была палітрукам у Чырвонай арміі.

Тав. Новік добра вядома сялянам Езярышчанскага і Гарадокскага раёнаў, сярод якіх яна карыстаецца вялікім аўтарытэтам.

Узмацненьне крэдытнай сеткі.

Бабруйск, 14-XI. На працягу апошняга гаспадарчага году грашовае становішча крэдытных таварыстваў на акрузе значна ўзмацнілася. У сярэднім на адно таварыства ўклады цяпер дасягаюць 7600 руб., капіталы 28 тыс. рублёў, у той час, як у мінулым годзе капіталы дасягалі 14 тыс. на таварыства і ўклады 4300 рублёў.

Сяляне калектыўна здалі 600 пудоў хлеба.

БАБРУЙСК, 14-XI. Сяляне вёскі Цалевічы і пасёлку «Кастрычнік» Слуцкага раёну, на сваім агульным сходзе пастанавілі здаць калектыўна ў крэдытнае таварыства 400 пудоў хлеба. У нядзелю хлеб арганізаваным чынам быў дастаўлен у гор. Слуцак на загатавіцельны пункт, прычым замест 400 пудоў ёю было здадзена 600 пудоў.

Першымі пачынальнікамі арганізацыі калектыўнай здачы хлеба зьявілася вясковая беднота.

Арганізацыя сельска-гаспадарчых майстэрняў.

Бабруйск, 14-XI. Акрвыканком вынес пастанову аб арганізацыі 5 стацыянарных майстэрняў па рамонту сельска-гаспадарчых машын.

Такія майстэрні будуць створаны ў Бабруйску, Жлобіне, Слуцку, Турску і Асіповічах.

Апрача таго, будзе арганізавана 9 перасовачных майстэрняў і будуць узмоцнены майстэрні пры савгасах, якія існуюць цяпер.

На ўсе гэтыя мерапрыемствы вызначаецца адпусьціць 60500 рублёў.

ПЕРАВОД НА ШМАТПОЛЬЛЕ.

Бабруйск, 14-XI. За апошні год працы акрземаддзел перавёў на шматпольле 32058 гэктараў зямельнай плошчы. Гэтая лічба зьяўляецца лічбай, роўнай 50 проц. усёй пераведзенай на шматпольле плошчы з часу рэвалюцыі да апошняга году. Цяпер ужо 40 проц. зямляўпарадкаванай плошчы зямлі пераведзена на шматпольле па акрузе.

Вылучэньне рабочых.

ГОМЕЛЬ, 13-XI. Прэзыдыум акрпрафсавету вылучыў рабочага заводу імя Томскага т. Конаводава на пасаду інспэктара працы ў Рэчыцы.

Загатоўкі ў Полаччыне.

(Ад нашага карэспандэнта).

У канцы кастрычніка і пачатку лістапада месяцаў г. г. адбыўся пленум Полацкага акрвыканкому. Побач з іншымі пытаньнямі на пленуме стаяла і займала належнае месца пытаньне аб ходзе загатовак па акрузе.

Заслухаўшы і абмеркаваўшы даклад інспэктара гандлю аб выкананьні пляну загатовак сыравіны і сельска-гаспадарчых прадуктаў за 1927-28 г. і падрыхтоўкі да загатовак на 1928-29 г. Пленум Акрвыканкому сьцьвердзіў, што агульнае выкананьне пляну загатовак сыравіны і сельска-гаспадарчых прадуктаў за 1927-28 г. праходзіць здавальняюча.

Адначасова адзначана недавыкананьне пляну па наступных відах загатовак: па ільну-валакну па 29,2 проц., валакну на 40,0 проц. лікам на 40,4 проц., дробнай скуравіне на 21,5 проц. шчаціне на 20,0 проц., па насьпях на 45,5 проц., смале на 29,5 проц., шпігінару на 16,0 проц. і на жывых гусях недавыканана на 31,7 проц. Па сярэдніх гадавых загатоўчых цэнах не давыкананьне пляну складае суму 400.000 рублёў.

Недавыкананьне пляну па пералічаных аб'ектах, кампэнсуюцца перавялічэньнем на 700.000 руб. каштоўнасьці загатовак па шэрагу іншых аб'ектаў, як напр, жыта 183 проц., грыбы 251 проц., рыба—183 проц., буйная скуравіна—135 проц. мохавая скуравіна—139 проц., конволас 104 проц., кара 371 проц., кішкі 134 проц. ягады 891 проц. яравіна—127 проц., мяса 121 проц., масла кароўе 360 проц., пушніна 168 проц. лексыравіна—181 проц., рызьзё—129 проц., ракі 122 проц. і яблыкі 122 проц. Акрамя таго загатоўлена значная колькасьць сыравіны непрадугледжанай па пляну.

Недавыкананьне пляну па ільну-валакну і ільну-насеньню тлумачыцца часткова перавялічэньнем заданьняў, а па ільну апрача таго і нізкімі цэнамі на лён у параўнаньні з рынкамі сумежных округ. Да ліку недахопаў загкампаніі трэба аднесьці ненадрыхтаванасьць загатоўчага апарату, часткова канкурэнцыя, слабы нагляд і кіраўніцтва загатоўкамі з боку РВК у раёнах і з боку акруговых устаноў (Акрсельсаюз, Спажыўсаюз, Белдзяржгандаль, Скурсынды-кат, Белмясгандаль).

Складзены плян загатовак на 1928-29 г. і загатоўчую сетку Пленум зацьвердзіў, у прыватнасьці дапусьціўшы да загатовак ільну-валакна і ільну-насеньня апрача сельска-гаспадарчай кааперацыйнай сыстэмы і Белдзяржгандаль з ахопам рынку апошнім у 20 проц.

Адначасова ўзьнята хадайніцтва перад СНК БССР аб устанаўленьні загатовак ільна-насеньня, ільна-валакна ў першым квартале на 50 проц. пляну, а 35 проц., прымаючы пад увагу мэтэорологічныя ўмовы акругі, якасьць ільну і г. д.

Пленум пастанавіў забараніць Белдзяржгандалю закупляць ільняное валакно ад закантрактаваных гаспадарак да таго часу, пакуль гэтыя гаспадаркі не здадуць у прадугледжаны дагаворам тэрмін закантрактаваную колькасьць валакна сельска-гаспадарчай кааперацыі.

Пленум Полацкага акрвыканкому даў цэлы шэраг практычных паказаньняў усім установам, якія маюць сувязь з загатоўкамі аб хутчэйшым праведзеньні ў жыцьцё намечанага пляну. Некаторыя раёны ўжо пасьпяхова распачалі працу.

Тарас Вярэіла.

Полацак.

Новыя шэрагі на грамадзкую працу.

ПЕРАВЫБАРЫ ДЭЛЕГАЦКІХ СХОДАЎ ЖАНЧЫНЫ ВЫЛУЧЫЛІ КАДРЫ НОВЫХ ГРАМАДЧЫЦ; БУДЗЕМ ДАПАМАГАЦЬ У ІХ ПРАКТЫЧНАЙ РАБОЦЕ

ПРАВОДЗІМ У ЖЫЦЬЦЁ ЛЕЗУНГІ ЛЕНІНА.

Па нашаму райёну перавыбары дэлегацкіх сходаў у гэтым годзе прайшлі як ніколі з вялікім уздымам. Кожная старая дэлегатка і таксама нанова абраная эразумела сэнс самакрытыкі. Зьнізу крытыка ўзьнялася вялікай хваляй, якую ўтрымліваць было-б злачынствам. Кожная жанчына, наведваючая дэлегацкі сход, даведалася аб чым трэба гаварыць і як трэба ўцягваць у гэтую працу новыя жаночыя пласты. Летась існавала 5 дэлегацкіх пунктаў з лікам дэлегатак—183 чалавек. За ўвесь год выбыла па розных прычынах толькі 26 чалавек, з якіх менш усяго батрачак і бяднячак.

У гэтым годзе арганізавана дэлегацкіх сходаў—9, якія аб'яднаюць 268 чалав. Па сацыяльнаму складу: бяднячак—146, сераднячак—50, саматужніц—13, калгасьніц—5, служачых—5, хатніх гаспадынь—25, парабчанак—16, інш.—8. Пры ўсіх дэлегацкіх пунктах арганізаваны сэкцыі: аховы мацярынства і дзіцяці, кааперацыйныя і батрацкія.

У час правядзеньня перавыбараў дэлегацкіх сходаў удзельнічала 2398 жанчын, якія і высунулі новых актыўных будаўнікоў сацыялізму. Ніводная кандыдатура ня прыймалася без усебаковага абгаварэньня. Мінулыя дэлегацкія сходы прарабілі вялікую працу, як гаспадарчую, так і культурна-выхаваўчую. У выніку чаго маюцца і рэальныя вынікі.

Па некаторых пунктах набыты калектыўныя абмёнкі 2-ое пазыкі індустрыялізацыі, аказана дапамога бяднэйшым дзецям, якая выявілася ў тым, што былі набыты касьцюмы і падараваны бяднейшым дзецям у дзень сьвяткаваньня 1-га мая (Вацэвіцкі пункт).

Высунута на розныя кіруючыя пасады 5 жанчын, як, напр., старшыні раённага камітэту ўзаемадапамогі, загадчыцы кааперацыйнае крамы, старшыні калгасу, сэкратара сельсавету і інш. Уступілі ў партыю дзьве дэлегаткі, якія вяўляюць у працы вялікую актыўнасьць. Усе гэтыя факты гавораць аб тым, што слова т. Леніна „Кожная кухарка павінна навучыцца кіраваць дзяржавай“ праводзіцца ў жыцьцё.

Арганізаваныя дэлегацкія сходы сёлета ўжо распачалі працу. Скліканая нарада кіраўнікоў, на якой прапрацаваны пытаньні па праграме заняткаў—абгавораны формы і мэтады. Праведзеныя першыя заняткі паказалі вялікую зацікаўленасьць дэлегатак да працы. Леташні склад сябе апраўдаў, нанова арганізаваныя пункты дадуць яшчэ больш станоўчыя вынікі. Трэба толькі ўсім мясцовым арганізацыям у гэтай працы дапамагаць.

Аноцкі.

м. Клічаў, Бабруйскае акругі.

ПЕРАВЫБАРЫ ДЭЛЕГАЦКІХ СХОДАЎ У КРУГЛЯНШЧЫНЕ.

Да 7-га кастрычніка г. г. па ўсёй Круглянщчыне пракацілася хваля падрыхтоўчых і выбарчых сходаў сялянак на перавыбарах дэлегацкіх сходаў на 1928-29 г.

З бадзёрым настроем сялянкі абмяркоўвалі пытаньні аб працы сярод апошніх на вёсцы.

Партыйная арганізацыя таксама аднеслася ўважліва да гэтае справы. Быў своечасова выпрацаван плян і каляндарны расклад па перавыбарах і выпуску дэлегацкага сходу, які падрабязна абмяркоўваўся на бюро партыйнае ячэйкі.

Акрамя гэтага былі вылучаны партыйцы для правядзеньня сходаў на вёсцы. Усяго было праведзена 3 падрыхтоўчых сходы, на якіх прысутнічала 137 асоб.

На сходах прапрацаваны пытаньні аб значэньні дэлегацкіх сходаў і наогул працы партыі сярод жанчын і вынікі працы дэлегацкага сходу леташняга складу.

На правядзімых падрыхтоўчых сходах сялянкі выказвалі свае пажаданьні, каб у далейшым дэлегатак, якія прымаюўваюцца да тае ці іншае ўстановы, выклікалі на пасяджэньні, чаго да гэтага часу ня было, потым няма належнага тавару ў кааператыве, трэба, каб яго адпускалі своечасова, аб укараненьні калектыўных гаспадарак на вёсцы, аб палепшаньні працы па калектывізацыі. Вось думкі сялянак, іх словы, якія проста і яскрава выказваліся на агульных сходах. Выказалася ўсяго 11 жанчын.

Выбарчых сходаў таксама было 3, прычым прысутнічала на іх 273 жанчыны. Неабходна адзначыць, што праводзімыя падрыхтоўчыя сходы зьявіліся некаторым штуршком больш актыўнага ўдзелу жанчын на выбарчых сходах. На ўсіх выбарчых сходах значны ўдзел прымалі і мужчыны. Прысутнічала 36 чал., выказалася 2 у спрачках па пытаньні палепшаньня масавае працы.

На перавыбарчых сходах жанчыны дзелавіта вырашалі пытаньні з практычнымі прапановамі на далейшы час, асабліва па пытаньні аб выбарах дэлегатак.

Сацыяльны склад дэлегацкага сходу на 1928-29 г. наступны: сялянак-бяднячак 18, сераднячак—5. Неабходна адзначыць, што ў гэтым годзе большая колькасьць бяднячак, якія ў мінулым годзе зусім адсутнічалі. Батрачак 4, тэхнрацаўніц—3. Саматужніц—2. Па нацыянальнасьці яны падзяляюцца наступным чынам: яўрэек—5, беларусак — 31. Трэба адзначыць узмацненьне яўрэек у склад дэлегацкага сходу як дасягненьне, бо летась гэтага ня было.

З агульнае колькасьці панова абранага дэлегацкага сходу 1 дэлегатка толькі кандыдат партыі, рэшта беспартыйныя.

З іх некаторыя ёсьць 2 скліканьня. Выпуск дэлегатак старога складу праведзен з урачыстасьцю. Выпушчана 32 дэлегаткі, якія за працадзольнасьць атрымалі ў падарунак кніжкі.

Выпуск скончыўся спэктаклем, вусным газэтай і бадзёрымі абяцаньнямі—новых дэлегатак аб дасягненьнях практычнай працы сярод сялянак Круглянщчыны.

Ермалаеў Цімох.

М. Круглае, Аршанскае акругі.

ДЭЛЕГАЦКІЯ СХОДЫ ПРАХОДЗІЛІ АКТЫЎНА.

(Барысаў).

Перавыбарных сходаў па Барысаву было 26, на якіх прысутнічала 1356 жанчын.

Наведваньне сходаў па Барысаву складае—60 проц., а па Нова-Барысаву—85-90 проц.

Перавыбары наогул праходзілі досыць актыўна. Па справаздачах даваліся шэраг указаньняў у працы дэлегацкага сходу, высоўваемыя кандыдатуры выказвалі жаданьне працаваць у дэлегацкіх сходах.

На фабрыках «Чырвоная Бярэзіна» і «Домбаль» прайшлі перавыбары па цэхах, на якіх прысутнічала 85-90 пр. работніц і рабочых.

Усяго абрана 361 дэлегатка. Работніц абрана 248 чал., альбо 68,7 пр.; беларусак абрана—206 чал. альбо —57 пр. і яўрэек 94 чал.—26 пр.; сярод абраных—23,2 пр. альбо 84 чал. няпісьменных.

У асноўным можна сказаць, што дырэктывы партыі ў пытаньні падбору дэлегатак па сацыяльнаму, нацыянальнаму і ўзроснаму складу выкананы.

Урачыстых выпускаў было 7 на розных прадпрыемствах. На сходах выступалі старыя дэлегаткі.

Праводзілася раздача падарункаў.

У асноўным трэба адзначыць, што кампанія дэлегацкіх сходаў прайшла па Барысаву здавальняюча.

Большасьць ячэек удзяляла дастатковую ўвагу гэтай кампаніі шляхам асьвятленьня перавыбараў у насьценных газэтах.

Таксама ахоплены дэлегацкімі сходамі ўпяршыню, дагэтуль неахвачаныя: в. Дымкі, Лядзішча і Краснаармейскай, дзе абрана 16 жанчын, з іх 8 сялянак.

Клябанаў.

Барысаў.

Як „разбройваецца“ Францыя.

На старонках «Савецкае Беларусі» мы нераз пісалі ўжо аб тым, як французкі імпэрыялізм рыхтуецца да вайны з намі, ён ужывае ўсе захады, каб падрыхтаваць да наступу на Савецкі Саюз нашых бліжэйшых суседзяў—Польшчу і Румынію.

Пісалі мы і аб англа-французкай згодзе і аб імкненьні ўцягнуць у гэту згоду фашысцкую Італію, і аб бязконцых падарожжах па Эўропе французкага генэрала Леранда і аб распрацаваным, таксама пры ўдзеле генэрала Леранда, пляне нападу Польшчы і Румыніі на нашу рэспубліку.

Буржуазны ўрад французкае рэспублікі мае звычай хваліцца перад усім сьветам, што ён не прасьледуе ніякіх агрэсыўных мэтаў, што ён імкнецца да міру і да ўсеагульнага разброеньня, што Францыя «Нацыянальнага яднаньня», Францыя Пуанкарэ і буйнага капіталу сама разбройваецца.

Аб гэтым сьпявае на ўсе лады стаўленік французкае буржуазеі ў Лізе Нацый «сацыяліст» Поль Бонкур, аб гэтым падпяваюць яму таксама на ўсе лады буржуазныя і сацыялістычныя газэты, пачынаючы з манархічнага «Акцыён Франсэз» і канчаючы „Попюлерам“ Лявона Блюма.

Паглядзім яшчэ раз, як у сапраўднасьці «разбройваецца» буржуазная Францыя, як у сапраўднасьці імкнецца яна да „міру“ між народамі.

* * *

Папершае, пару слоў аб бюджэце, нядаўна зацьверджаным фінансавай камісіяй французкае палаты дэпутатаў. Зусім натуральна, што калі краіна ня імкнецца ні да якіх ваенных авантур, калі яна толькі жадае міру ва ўсім сьвеце, дык і бюджэт яе павінен мець больш мірны характар. Інакш кажучы, выдаткі яе па вайсковаму міністэрству павінны ня толькі павялічвацца, але і адносна штогод зьмяншацца.

Зусім адваротнае наглядаем мы ў сучаснай буржуазнай Францыі. Бюджэт ураду Пуанкарэ на 1929 г. прадугледжвае **павялічэньне выдаткаў па вайсковаму міністэрству на паўтара міліёны франкаў.** Калі ў 1928 годзе на падрыхтоўку да вайны было патрачана 7 міліярдаў 660 міліёнаў франкаў, дык у 1929 годзе на тыя-ж мэты **мяркуецца патраціць больш дзевяці міліярдаў франкаў.**

Падругое, аб арміі. Армія—пульс ваеннае падрыхтоўкі краіны, гэта барометр, па якому можна даволі лёгка вызначыць да чаго імкнецца дачы урад—да міру, ці да вайны, і якія яго патаемныя мэты.

У якім-жа становішчы знаходзіцца цяпер французкая армія, ці разбройваецца яна, ці зьмяншаецца яна колькасна.

Гэтымі днямі адна з вельмі аўтарытэтных буржуазных газэт Францыі—«Голуа»—пісала наступнае: Французкая армія ў 1922 годзе ў мэтраполіі налічвала 174 пахотных палкоў, 31 батальён альпійскіх стралкоў і 79 палкоў кавалерыі. Да вясны 1929 г. мяркуецца расфарміраваць 89 пахотных палкоў, 10 батальёнаў альпійскіх стралкоў і 34 палкі кавалерыі.

Адгэтуль, зразумела, вывад, што вось мы разбройваемся, што мы ня рыхтуемся да вайны. Але гэтая грубая падтасоўка лічбаў можа ашукаць толькі неасьведамлёнага, можа прывесьці ў замяшаньне толькі чалавека, зусім незнаёмага з умовамі фарміраваньня французкае арміі. Але ларчык вельмі проста адчыняецца.

Ня трэба забываць, што ў 1922 годзе кожны французкі полк налічваў усяго каля тысячы чалавек салдат, прычым шэраг палкоў толькі лічыўся на паперы, бо яны поўнасьцю былі разгромлены ў часе імпэрыялістычнае вайны.

У 1929 г. шэсьць палкоў маюць па 2300 чалавек, а іншыя па 1.580 салдат. Так што, калі нават дзякуючы рэарганізацыі французкае арміі колькасьць баявых адзінак быць можа і зьменшылася, але затое колькасьць салдат у палках і ў батальёнах бязупынна расьце. І гэта ня лічачы шэрагу зусім новых фарміраваньняў, існаваўшых у 1922 г. толькі ў зародкавым становішчы як, авіацыя, танкавыя часьці, атрады матацыклістаў і д. т. п.

Апрача таго, трэба прыняць пад увагу і тую акалічнасьць, што цяпер шэраг пасад у французкай арміі, як пісары ў кіраўніцтвах і інш., запаўняюцца вольнанаёмнымі, што вызваляе значную колькасьць мабілізаваных ад абавязкаў нестраявой службы. А гэта ў сваю чаргу павялічвае значную колькасьць салдат у страю.

Мы не гаворым ужо аб імкненьні шляхам вядомага закону «сацыяліста» Бонкура аб «узброеньні нацыі» ваенізаваць усё насельніцтва. Мы не гаворым тут аб увядзімай дапрызыўнай падрыхтоўцы, аб ваенізацыі школ і універсытэтаў, аб закліку на трохтыдневую перападрыхтоўку рэзэрвістаў.

Зварочваючыся назад да сухіх афіцыйных лічбаў, заўважым, што ў 1913 годзе пад французкімі сьцягамі знаходзілася 558.000 салдат, а ў 1928 г. гэта лічба дасягнула ўжо 702.000. У 1929 г. мяркуецца не вымяншэньне, а вельмі значнае павялічэньне салдацкага кантынгэнту.

* * *

Рыхтуючыся да вайны з СССР, французкая буржуазея не выпушчае з-пад сваёй «прыхільнай» увагі і свой уласны пралетарыят.

«Мір» у прамысловасьці падтрымліваць ёй удаецца ўсё цяжэй і цяжэй. Даведзены да роспачы, французкі рабочы пачынае ўсё больш разумець, хто яго вораг, а хто прыяцель. А цяжкія матар'яльныя ўмовы існаваньня бязупынна напамінаюць яму, што толькі адкрытай барацьбой з сваёй уласнай буржуазеяй ёй здолее дамагчыся лепшае будучыні. На рэгулярную армію, якая складаецца з тых-жа рабочых і сялян, надзея таксама слабая. У кожным выпадку для прыдушэньня рабочых паўстаньняў французкая буржуазея іх ня можа лічыць зусім надзейнымі.

Вось чаму цяпер французкі ўрад узмоцнена згуртоўвае свае калёніяльнае войска бліжэй да Парыжу і да іншых буйных прамысловых цэнтраў, навіроўваючы менш «палітычна надзейныя» часьці ў далёкія калёніі. Яна спадзяецца з дапамогаю г. зв. «каляровага» войска, менш сьвядомага і менш ведаючага ўсе падзеі, прыдушыць «непарадкі» ўнутры сваёй краіны. Яна спадзяецца з дапамогаю гэтага „каляровага“ войска прымусіць свой уласны пралетары

ЖЫЦЬЦЁ І ПРАЦА АСЬВЕТНІКА.

Перагружанасьць праграм аднакамплектнай школы.

Па заданьні Наркамасьветы, з 5-га па 8-е лістапада было праведзена абсьледаваньне школ Беларусі—4-х гадовых, нацыянальных і аднакамплектных. Тыя пытаньні, якія былі высунуты, дастаткова былі абгаворваны настаўнікамі, сумесна з інспектарам.

З абгаварэньня выявілася, што нашы сучасныя праграмы надта вялікія, і аднакамплектная школа ўсяго ахапіць ня можа за кароткі навучальны год. Кожны настаўнік аднакамплектнае школы імкнецца даць дзецям хоць-бы тыя фармальныя звычкі, якія вызначаны ў праграме, ня ўвязваючы іх з мясцовым матар'ялам.

Праграмы запоўнены грамадазнаўчым матар'ялам, які вывучаецца толькі ў 4-й групе, а ў першых 3-х яго ня вывучаюць так, як гэта патрабуе. Дзецям не падаецца грамадазнаўчы матар'ял у кожнай групе, згодна іх разьвіцьцю, а ўсё адцягваецца да 4-й групы, што яшчэ больш не дае магчымасьці выканаць гэтае праграмы. Вялікая праграма і па расейскай мове.

Вывялася таксама, што школы амаль зусім ня ўвязваюць комплексу з практычным жыцьцём раёну, за адсутнасьцю статыстычных краязнаўчых раённых падручнікаў.

Пагэтаму вывад такі, каб аднакамплектныя школы з 4-мя групамі зьнішчыць, а выпускаць вучняў за тры ў аднакамплектных, а ў двухкамплектных за чатыры групы.

Гэта дасьць магчымасьць ня гнацца за праграмай, а больш стала прапрацаваць праграмны матар'ял у аднакамплектных школах.

Вучні, выпушчаныя з аднакамплектнай школы, пазінны будуць ахапляцца 4-й групай двухкамплектнае школы. Вось практычны выхад з гэтага становішча. Толькі тады аднакамплектныя школы змогуць лепш увязваць мясцовы краязнаўчы матар'ял, а таксама праводзіць комплекснасьць. Ш—ў

Растуць новыя няпісьменныя.

((Чавускі раён, Магілеўшчына).

Раён, які абслугоўвае Благавіцкая пачатковая школа, мае 376 двароў, з іх заможных каля 14 проц., рэшта беднякі і малая частка сераднякоў. Дзяцей школьнага ўзросту ад 8 да 12 гадоў 156, ад 12 да 14 гадоў—72, разам 228 асоб, якія жадаюць атрымаць пачатковую асьвету.

У бягучым годзе насельніцтва на сродкі самаабкладаньня адрамантавала будынак школы, зрабіла тры клясы, каменны падмурак, кожная кляса можа ўмясьціць па 80 вучняў.

Чавускі райвыканком абяцаў адчыніць трэці камплект, але да гэтага часу камплекту няма. Два настаўнікі могуць ахапіць толькі 100 вучняў, а рэшта застаецца па-за школай. Такім чынам, нарастаюць новыя няпісьменныя. Становішча вельмі дрэннае.

Тут яшчэ ў бягучым годзе ў Благавіцкім сельсавеце набіў град пасевы, і насельніцтва ніяк ня можа дапамагчы школе.

Школьная рада ўзьнімала хадайніцтва перад райінспектарам аб адчыненьні 3-га камплекту ў бягучым годзе, але на іх хадайніцтва адказалі, што на Чавускі раён замест 9 камплектаў далі толькі 4 камплекты, якія разьмеркавалі там, дзе праводзіцца ўсеагульнае навучаньне.

Школьная рада падала хадайніцтва ў ЦВК Беларусі. Калі даведалася аб гэтым чавускае райвыканкомаўскае начальства, дык пачало крыўдзіцца—чаму падалі ў ЦВК бяз іхняга ведама.

Школьная рада бачачы, што немагчыма прыняць усіх жадаючых вучыцца дзяцей, на два тыдні выключыла 2-ю клясу, каля 50 асоб, і калі Чавускі РВК на зьверне ўвагі ды не адчыніць 3-га камплекту, дык прыдзецца зусім выключыць 40 асоб са школы.

В. М. Чамаданаў.

Так званыя „настаўнікі беларускіх школ".

Болькі ўжо разоў ганарылася аб правядзеньні беларусізацыі на тэрыторыі Бабруйскай акругі! Здавалася-б, што ўжо аб гэтым гаварыць досыць. Але пытаньне беларусізацыі для настаўнікаў чыгуначных школ, аб'яднаных Асіпавіцкім мясцкомам, усё яшчэ новае. А для ненастаўнікаў—нават незразумелае.

Запытайце кіраўніцтва чыгуначнымі школамі: «А якія ў вас, братцы, школы, хоць-бы на станцыях—Бабруйск, Асіпавічы, Верайцы і Пухавічы»? І вам без запінкі і са зьдзіўленьнем адкажуць:

«О, даўно ўжо гэтыя школы беларусізія. Аб гэтым позна пытацы!»

І зразумела, з Гомелю яно так і здаецца, нават там у сьпісах так і значыцца: «беларускія школы: Бабруйская, Асіпавіцкая..."

Школы то беларускія, але настаўнікі не гавораць пабеларуску.

Факты? Наце вам і факты.

27 кастрычніка гэтага году на станцыі Асіпавічы ў памяшканьні чыгуначнай школы адбывалася канфэрэнцыя настаўнікаў нізавых школ.

Спрэчкі па дакладу мясцкому аб яго працы.

Мова? Ну, зразумела, расейская, бо гэта-ж ня клясы, а перад прамоўцамі ня вучні, а такія-ж настаўнікі, як і прамоўца.

Меў, праўда, імкненьне ўжываць беларускую мову прадстаўнік дарожнага праўленьня саюзу працаеньветы—з Гомля, але асьцярожна, бо акаляючая „среда", з дазволу сказаць,—настаўнікі... беларускіх школ.

Адзін раз адзін пасажыр, праязджаючы па чыгунцы па БССР, разважаючы з суседзямі, казаў: „Так званая беларуская мова". Цяпер гэты выраз як раз прыгадзіўся, і перарабляць яго мала прышлося.

«Так званыя, настаўнікі беларускіх школ». Тарас Цаца.

Як даецца асьвета рабочым.

У Полацкай акрузе галоўным згуртаваньнем рабочых зьяўляецца шкляны завод «Труды», дзе працуе 600 рабочых, ня лічачы сезонных. Хоць рабочыя шкляных заводаў па спэцыфічнасьці ўмоў працы і не застанаўліваюцца доўга на адным месцы, але незалежна ад гэтага дзяцей у школу пасылаць трэба, каб даць хоць-бы першапачатковую асьвету, каб не засталіся няпісьменнымі.

Савецкая ўлада паставіла пытаньне, каб асьвета рабочым давалася ў першую чаргу. У асноўным яна праводзіцца так. Асабліва ў гэтым годзе быў узяты напрамак на пралетарызацыю ўсіх навучальных установаў. Вынікі ад'гэтага атрымаліся добрыя. Сямігодкі запоўнены дзяцьмі беднаты і рабочых, у падтэхнікум прынятыя ўсе жадаўшыя дзеці рабочых і частка беднаты, якая звольнена ад падатку ці плоціць падатку да 3 рублёў.

Але і ці пагледзець колькі ў падтэхнікуме рабочых, дык іх зусім нязначная колькасьць. Прадстаўнікоў заводу „Труды" наецца толькі двое, ды і то тыя, што скончылі 7-ку дзесь у інш. месцы. Гэта, бязумоўна, ненармальна. На самым заводзе ёсьць усяго адна 4-хгодка, а ад цэнтру раёну або гораду завод на адлегласьці 50 кілямэтраў. Дзеці рабочых, такім чынам, замест таго, каб выхоўвацца, па скончаньні 4-хгодкі, пакуль яго прымуць на працу — да 16-цігадовага ўзросту—хуліганяць, пачынаюць піць гарэлку і, разумеецца, выходзяць у халейшым дрэннымі будаўнікамі сацыялізму.

За ўвесь час і ў рабфакі паступіла ўсяго 4 асобы, ды і тыя падрыхтаваліся ў Чырвонай арміі.

Кожны год рабочыя і заводзкі камітэт узьнімаюць пытаньне аб адчыненьні 7-кі, але ўсё бяз вынікаў. Спрабавалі ўжо ўтрымоўваць пятую групу нелегальна на ўласны кошт, але і гэта забаронена.

Грамадазнаўца--матэматык.

(Бабруйшчына).

Загадчык Любоніцкай 7-мігодкі т. Бабарэка абюракраціўся. Летась ён быў хоць крыху чалавекам, а ў гэтым—а ні кроплі. Напрыклад, для ленінскага кутка няма пакою, а сабе пад кватэру ўзяў два пакоі, крычыць у адным з іх стаіць толькі адзін стол. Па палепшаньне вучнёўскага інтэрнату няма сродкаў, а для абклейваньня абоямі сваіх пакоў і фарбаваньня падлогі—ёсьць.

Ня мае ён і належнага выхаваўчага падыходу да вучняў. Толькі і ведае, што „Я ва вас дабяруся", „Я вам накручу хвост", «Трэба зажаць гайку» і г. д.

Свой вучань.

„У нас аднаго мэтаду няма".

(Слуцкая школа сялянскай моладзі).

Доўгі час наша школа сялянскай моладзі не магла знайсьці сабе сталага месца. Раней працавала ў самым Слуцку, потым перакінулі ў савгас Некрашы, а цяпер—назад у Слуцак. У сучасны момант кажуць, што школа ўсталюецца тут на доўгі час. Пажывем—пабачым.

Пакуль што школа знаходзіцца ня зусім у добрых умовах. Інтэрнатам захоплена толькі частка вучняў, а другая частка навінна жыць на прыватных кватэрах. Пры памяшканьнях адсутнічаюць калідоры і кладоўкі. Усе рэчы і харчы знаходзяцца ў тым-жа памяшканьні, дзе вучні сьпяць. Рукамыйнік цэлую зіму стаіць на дварэ, бо ў будынку няма яму месца.

У невялічкіх пакойчыках месьціцца па 4-5 вучняў. Усюды цесната, адсутнасьць гігіенічных і санітарных умоў жыцьця.

Настаўніцкі склад ня зусім адпавядае свайму прызначэньню. Сярод яго —адзін падтэхнікумавец, адзін—рабфакавец, адзін—скончыўшы II ступень і 2—агрономы. Мы бачым, што ў школе амаль што зусім адсутнічаюць мэтадыстыя. „У нас аднаго мэтаду ў выкладаньні няма: кожны працуе па сваім уласным мэтадзе",—кажа загадчык школы.

У школе ў сучасны момант вучыцца 93 вучні, пераважна беларусы. Ня гледзячы на гэта, школа да гэтага часу цалкам не беларусізавалася. У старэйшых клясах выкладаньне вядзецца пераважна на расейскай мове. Сельская гаспадарка, прыродазнаўства і грамадазнаўства выкладаюцца выключна на расейскай мове. Сам загадчык слаба ведае беларускую мову і, як відаць, ня вельмі дбае аб беларусізацыі школы. Тлумачыць гэта ён тым, што па сельскай гаспадарцы няма падручнікаў па белмове і што нельга спэцыяліста-агранома прымусіць выкладаць пабеларуску, бо ён можа пакінуць школу. Вучні старэйшых груп ужо зрусіфікаваны і пераважна ўжываюць у гутарках расейскую мову. І гэта робіцца ў той час, калі школа вядзе грамадзкую працу сярод вакалічнага сялянства.

Заганаю школы зьяўляецца і невялікі лік дзяўчат у школе. У леташнім годзе вучылася 8 дзяўчат, з якіх у школе засталося толькі 2, а іншыя былі зведены са школы ці за непасьпяховасьць, ці па іншых прычынах. У сучасны момант у школе вучыцца ўсяго 12 дзяўчат. Наогул заўважаецца, што дзяўчаты ў школу вучыцца ня йдуць, і адміністрацыя школы асаблівых мер да ўцягненьня дзяўчат ня прымае.

Пасьля пераезду ў горад школа апынулася бяз сельска-гаспадарчага інвэнтару, жывёлы і нават часова без зямлі. Толькі праз два месяцы надумаліся перадаць маемасьць агрупункту, а самы агрупункт перавесьці ў іншае месца. Школа ня можа карыстаць усе тэарэтычныя веды на практыцы, і гэта выклікае нездаволеньне часткі вучняў. Праўда, ёсьць і такія вучні, якія зусім адмаўляюцца прымаць удзел у практычнай працы і ўсялякімі спосабамі ўхіляюцца яе.

Шмат перашкаджае ў працы і невялікі лік стыпэндый, якімі нельга задаволіць усіх бяднейшых вучняў. Стыпэндыі прыходзяцца дзяліць на часткі, якія ня могуць забясьпечыць вучня. Толькі 2-3 вучні атрымліваюць цэлыя стыпэндыі, а іншыя—па 10, 8, 6 і нават 4 рублі. Ясна, што за 4 рублі вучань працаваць ня зможа і часта пакідае школу. На гэта трэба зьвярнуць асаблівую ўвагу і, калі будзе магчыма, у далейшым павялічыць лік стыпэндый. Гэтым будзе дадзена магчымасьць прыняць у школу выключна парабкоў і беднату.

Мытлянец.

Беларускія школы на Смаленшчыне.

14-15 кастрычніка г. г. у в. Сойна, Пятровіцкай воласьці, Рослаўскага павету, Смаленскае губ. адбылася павятовая канфэрэнцыя працаўнікоў асьветы беларускіх школ.

Усяго тут зараз маецца 16 школ, выкладаньне ў якіх вядзецца на беларускай мове. Настаўнікі амаль што ўсе прайшлі кароткатэрміновыя курсы пры Наркамасьветы БССР і досыць стала падрыхтаваны.

Беларускія школы добра забясьпечаны вучнёўскімі падручнікамі, а некаторыя маюць і досыць добрыя дзіцячыя бібліятэкі.

Беларусізацыя школ звычайна пачынаецца з 1-е клясы і штогод паступова ідзе да апотэяе. Ёсьць думка беларусізаваць Сойнскую школу II-й ступені. Гэта будзе першая беларуская школа павышанага тыпу на Расляўшчыне.

На канфэрэнцыі высьветлілася, што справа з беларусізацыяй ідзе досыць добра. Як настаўніцтва, так і насельніцтва вельмі зацікаўлена ў гэтай справе.

Настаўнік З. Косаў.

Падтэхнікумаўцы не падрыхтаваны па матэматыцы.

На II курсе фізмату падфаку БДУ ёсьць 29 студэнтаў, якія не прайшлі I курсу. З іх 27 скончылі падтэхнікумы. Усе яны ня маюць ніякіх навыкаў па элемэнтарнай трыгонамэтрыі і альгэбры. Гэта і ня дзіўна. У падтэхнікумах на II курсе ўсяго 2-3 гадзіны матэматыкі ў тыдзень. На I курсе падтэхнікумаў паўтараецца і дапаўняецца пройдзенае ў сямігодках.

Матэматыцы ў падтэхнікумах трэба адвесьці ня дзьве, але хаця-бы 6-7 гадзін на кожным курсе, ад I да III уключна. На рабфаках займаюцца студэнты матэматыкай ня 2, але 20 г. у тыдзень.

Асыстэнт БДУ Дамброўскі.

НАМ АДКАЗВАЮЦЬ.

На допіс, зьмешчаны ў газэце „Савецкая Беларусь" № 179 (2367) за 4 жніўня, па пытаньню аб дрэнных узаемаадносінах паміж настаўнікамі і вучнямі ў Дворжацкай 7-хгодкі, Інспэктура па Сацыяльнаму Выхаваньню НКА паведамляе, што для аздараўленьня Дворжацкай 7-хгодкі частка настаўнікаў (Францаў, Ягораў, Жаваранак) зведены, частка (Ляпчынскі і загадчык школы)—пераведены ў іншыя школы і рэшта падалі заявы аб пераводзе.

— Інспэктура па Сацыяльнаму Выхаваньню НКА паведамляе, што на допісу, зьмешчанаму ў газэце „Савецкая Беларусь" № 69 (2257) за 22 сакавіка г. г. пад назвою „Што перашкаджае культурнаму будаўніцтву" па пытаньню аб настаўніках Юравіцкай 7-годкі зроблена дасьледаваньне, у выніку якога для карысьці справы частка настаўнікаў і намесьнік загадчыка школы пераведзены па працу ў іншыя школы.

За палепшаньне дарог, за машынізацыю транспарту.

Будуйце добрыя дарогі.

Бяз добрых дарог немагчыма разьвіцьцё сельскай гаспадаркі, прамысловасьці, разьвіцьцё каапэрацыі і культурнае абслугоўваньне вёскі, немагчыма паступовае зьнішчэньне розьніцы паміж горадам і вёскай. Усе гэтыя задачы (разьвіцьцё сельскай гаспадаркі, прамысловасьці і г. д.), а ў тым ліку і пабудова добрых дарог могуць быць вырашаны толькі пры самым сьвядомым, рашучым і сталым удзеле шырокіх мас рабочых і сялян.

Нашым ідэалам на бліжэйшы пэрыяд мы лічым правядзеньне па ўсёй Беларусі ў розных канцы шасэйных, пасараваных, а ў некаторых выпадках асфальтавых дарог.

Мы хочам дабіцца таго, каб аўтамабіль быў масавым відам перасоўваньня як жыхароў, гэтак і тавараў; каб матацыклет быў звычайнай рэччу ня толькі ўстаноў, а і калектыўных гаспадарак; каб вэлісыпэд быў у кожнай сам'і.

На вялікі жаль, гэта ўсё пакуль што толькі мары: дарогі нашы такія, што ломяцца калёсы, калечацца коні, а аўтамабіль служыць толькі для выкананьня важнейшых дзяржаўных задач; дый тымі нямногімі аўтамабілямі, што ў нас ёсьць, цяжка карыстацца за адсутнасьцю добрых дарог. Наша беднасьць не дае пакуль што магчымасьці прыступіць да зьдзейсьненьня нашага ідэалу; мы да гэтага будзем ісьці паступова, па меры павялічэньня нашых сродкаў, палепшаньня дабрабыту насельніцтва і дзяржавы. Але гэта ня значыць, што можна адкласьці справу палепшаньня дарог.

Калі-б мы перасталі клапаціцца аб дарогах, спасылаючыся на нашу беднасьць, то былі-б падобны да тэй пасенькі, якая марыла аб ядкавай суконцы, а дзірак на локцях залатаць не хацела. Вось чаму трэба зараз-жа ведадкладна прыступіць, і мы прыступілі, да справы дарожнага будаўніцтва: з дзяржаўных сродкаў выдзяляецца на гэтую справу пэўная сума грошай; значная частка сродкаў на самаабкладаньні таксама ідзе на дарогі.

Але і на гэтым спыніцца няможна. Трэба як мага шырэй арганізаваць грамадзкую самадзейнасьць, каб пашырыць справу палепшаньня дарог. Кожны рабочы, селянін і, наогул, кожны грамадзянін Савецкай Беларусі павінен дапамагчы вырашэньню гэтай справы.

Трэба, каб на кожным заводзе, на кожным прадпрыемстве, у кожнай вёсцы была ячэйка «Аўтадору» і каб гэта ячэйка служыла актывам па ўцягненьню насельніцтва ў справу пабудовы дарог. Прыступіць да справы трэба неадкладна; трэба зьбіраць каменьне, падвозіць і падносіць яго да дарог, трэба асушваць лужы, раўнаць каўдобіны на дарогах, капаць канавы, абсаджваць дарогі дрэвамі. Кожная ячэйка „Аўтадору", а калі ячэйкі няма, то можная грамадзкая арганізацыя павінна паставіць і вырашыць ужо ў гэтым годзе хоць-бы невялікую, але практычную задачу па дарожнаму будаўніцтву. Заданьнем можа служыць: у вёсках—асушыць вясковыя вуліцы, вымасьціўшы іх каменьнямі, у гарадох—асушыць вуліцы каля прадпрыемстваў, а таксама вымасьціць іх каменьнямі. Калі гэта ўжо зроблена ў гарадох, то трэба, каб гарадзкія арганізацыі дапамаглі вёсцы. Так зможам мы паскорыць вырашэньне задачы пабудовы дарог. Моладзь наша павінна стаяць пры вырашэньні гэтай задачы наперадзе, успомніўшы добрыя прыклады «суботнікаў».

Толькі пры добрых дарогах і аўтамабільным транспарце можа быць больш шпаркае разьвіцьцё гаспадаркі і культуры нашай працоўнай краіны.

А. Чарвяноў.

Да 1-й аўталётарэі „Аўтадору".

Шпаркі рост сацыялістычнага будаўніцтва ва ўсім СССР, росквіт народнае гаспадаркі ў БССР, як частцы вялікага Саюзу, выклікаюць неабходнасьць значнага палепшаньня транспарту наогул і, у прыватнасьці, беларускага, вельмі заняпалага. Шчыльней падыходзячы да гэтай справы, мы бачым неабходнасьць высунуць адну з важнейшых сучасных задач—разьвіцьцё і палепшаньне дарожнага будаўніцтва і сталае дапасаваньне да мясцовага транспарту аўтамабіля. Аўтамашына, як гэткая, у абслугоўваньні самых рознастайных галін савецкае гаспадаркі павінна знайсьці сваё пачэснае месца і атрымаць пэўную пашану.

Да вырашэньня гэтай задачы павінна быць прыцягнена ўвага самых шырокіх працоўных мас. Вось дзеля прыцягненьня ўвагі савецкай грамадзкасьці да справы разьвіцьця аўтамабілізацыі і арганізацыі грамадзкай дапамогі пабудове і палепшаньню грунтавых шляхоў зносін у БССР і арганізавана таварыства «Аўтадор».

Такім чынам, на запытаньне, што такое «Аўтадор» і якую мэту ставіць ён перад сабою, кожны рабочы і селянін БССР павінен атрымаць адказ: гэта таварыства садзейнічаньня разьвіцьцю аўтамабілізму і палепшаньню шляхоў зносін у БССР. Гэта шырока-грамадзкая арганізацыя, якая мае сваёй галоўнай і беспасрэднай мэтай усебакова дапамагаць дапасаваньню да мясцовага транспарту аўтамабіля і іншых відаў механічных сродкаў зносін, а таксама арганізацыю грамадзкага садзейнічаньня пабудове і палепшаньню дарог. Шляхі ў нас у дрэнным становішчы, а транспарт, асабліва мясцовы, прымітыўны. Зусім лёгка пераканацца ў неабходнасьці хутчэйшага вырашэньня пастаўленых пры арганізацыі „Аўтадору" задач.

Падыходзячы да індустрыялізацыі нашай савецкай краіны наогул, мы ставім сабе ў абавязак напружыць усе свае сілы, здабыць такія сродкі, каб ня толькі дагнаць замежныя краіны, якія тэхнічна стаяць вышэй нас, але і перагнаць іх.

Па стану транспарту, на стану шляхоў зносін мы ў Саюзе ССР цалкам і БССР у прыватнасьці, больш, чым ва ўсіх іншых галінах гаспадаркі, асабліва адсталі. Зараз кожны працаўнік усёй сваёй істотай адчувае як індустрыялізацыя краіны вымагае патрэбу даць аўтамашыну. Існуючыя віды транспарту ў нас з кожным часам робяцца больш і больш нездольнымі справіцца з ускладаемымі на яго абавязкамі. Праўда, замяніць існуючы транспарт аўта-транспартам, пабудаваць шляхі—гэта значыць знайсьці, сабраць і мець сродкі, а іх няма, іх мала. Але і сродкаў няма з прычыны таго, што транспарт і дарогі ў нас дрэнныя.

У дачыненьні да сельскай гаспадаркі аўтамашына і дарога—магутны штурхоч: з трактарам, непрыклад, зьвязана інтэнсыфікацыя сельскай гаспадаркі, з грузавікам—аўтамабілем—зьвязаны своечасовы падвоз збожжа і, наогул, сельска-гаспадарчай прадукцыі з далёкіх с-г. ураджайных раёнаў нашай краіны да чыгунак і водзяных шляхоў; з аўтамашынай зьвязана своечасовая і танная дастаўка прадуктаў жывёлагадоўлі і прадуктаў малочнае гаспадаркі і інш. Для раскіданых на вялікіх прасторах і ў забалочаных раёнах сялянскіх дробных гаспадарак—дарога і аўтамашына адыграюць значную ролю ў справе далучэньня і набліжэньня іх да тэхнікі і культуры. Аўта-транспарт, які пойдзе па добраму шляху, бясспрэчна ўзмацніць самадзейнасьць працоўных сялянскіх мас, створыць спрыяючыя ўмовы да каапэраваньня іх, да калектывізацыі.

Дарога і аўтамашына, матацыкл і інш.—найлепшы сродак да ўтварэньня сувязі і лепшага абслугоўваньня вёскі горадам. Аўтамашына ў жыцьці гораду мае самае разнастайнае значэньне: перавозка пяжараў па гораду, сувязь з акраінамі і прыгарадамі, падвоз харчавых прадуктаў і фуражу, паштовая сувязь, санітарнае і медычнае абслугоўваньне гораду (выраз сьмецьця, паліўка вулиц), пажарная, міліцэйская служба і шмат інш.—вось тое, што хутка і з посьпехам выконваецца з ужываньнем аўтамашыны.

Кожнае з сваіх мерапрыемстваў, у тым ліку і падрыхтоўваемую зараз аўтамабільную лётарэю, „Аўтадор" накіроўвае да таго, каб згуртаваць увагу шырокай савецкай грамадзкасьці. „«Аўтадор» лічыць, што сіл і здольнасьці, а разам з тым і сродкаў у мільённых мас працоўных шмат, каб справіцца і з аўтатранспартнай праблемай.

А. Сташэўскі.

ЗАБЯСЬПЕЧЫМ ПОСЬПЕХ 1-й АЎТАМАБІЛЬНАЙ ЛЁТАРЭІ.

Два першыя зьезды па дарожнай справе і аўтатранспарту ў Маскве і Менску, якія нядаўна скончыліся, са ўсёй відавочнасьцю паказалі нам яшчэ раз, у якім дрэнным становішчы знаходзіцца дарожная і аўтамабільная справа, і што ў гаткім становішчы яна заставацца больш ня можа, бо будзе тармазіць нармальнае разьвіцьцё народнае гаспадаркі.

З кожным годам усё павялічваецца ўкладаньне сродкаў па бюджэту і крэдытных асыгнаваньнях, але становішча дарог настолькі сур'ёзнае, што гэтых сродкаў не хапае, каб задаволіць тэмп неабходнага будаўніцтва.

З арганізацыяй „Аўтадору" пачынаецца новая паласа працы па больш актыўнаму ўцягненьню ў справу дарожнага і аўтамабільнага будаўніцтва шырокіх мас рабочых і сялян. Шырокая сетка „Аўтадору" здолела за гэтае лета ажыцьцёвіць не адну сур'ёзную справу; зараз, за асеньні і зімовы час, праца, натуральна, павінна быць накіравана на падагуленьне вопыту, мабілізацыю яшчэ больш сіл, падрыхтоўку да новага сезону і падрыхтоўку для нармальнага ажыцьцяўленьня пляну матар'яльных сродкаў.

Аднэй з мер па павялічэньню дадатковых матар'яльных сродкаў, асабліва на аўтабудаўніцтва, зьяўляецца першая аўтамабільная лётарэя, якая арганізуецца «Аўтадорам» СССР і БССР.

Бязумоўна, што гэтая лётарэя з прычыны яе вялікага значэньня будзе актыўна падтрымлівацца ўсімі працоўнымі гораду Менску і ўсёй Беларусі.

Аўтамабіль зьяўляецца адным з сродкаў сацыялістычнай рэканструкцыі транспартнай справы. Аўтамабіль зьяўляецца самым моцным штуршком у справе найхутчэйшага палепшаньня кепскіх дарог, як і захаваньня існуючых ад псаваньня. Аўтамабіль дае і паказаў ужо гэта на справе, яшчэ лепшую сувязь гораду з вёскай, асабліва ў пытаньнях тавараабмену.

Такім чынам, тыя лётарэйныя білеты, якія павінны быць распаўсюджаны па БССР, пры нашай чуласьці будуць з посьпехам і своечасова распаўсюджаны, ведаючы, што гэтым мы зробім яшчэ новы шаг наперад у справе сацыялістычнага будаўніцтва і палепшым і патаньнім наш транспарт.

М. Карклін.

ПРАЦА ЯЧЭЕК „АЎТАДОРУ" НА ВЁСЦЫ.

На ўпарадкаваньне раённых і сельскіх дарог прыходзіцца мала сродкаў, і гэтыя дарогі застаюцца ў дрэнным становішчы. Праца вясковае ячэйкі «Аўтадору» (а таксама і ў мястэчку) ў першую чаргу павінна быць накіравана на лініі арганізацыі сіл мясцовага насельніцтва для прывядзеньня ў парадак дарог. Часта бывае так, што сяляне гадамі праклінаюць якую-небудзь гразьлю, ломяць восі, абварочваюць вазы з сенам і збожжам і калечаць коні толькі таму, што не знайшлося чалавека, які-б узяў на сябе ініцыятыву растлумачыць сялянам, што адзін-два дні дружнае супольнае работы—і ня будзе гэтае „дарожнае" мукі, што не знайшлося чалавека, які-б узяў на сябе клопат арганізаваць работу па папраўцы дарогі.

Гэту ініцыятыву павінны ўзяць на сябе райённыя, местачковыя і сельскія ячэйкі «Аўтадору». Сельскія, местачковыя, а таксама і гарадзкія ячэйкі (галоўным чынам, неакруговых гарадоў) павінны ў плянах свае працы абавязкова намеціць пункты, дзе сіламі насельніцтва магчыма і неабходна паправіць дарогу альбо мост; затым на сходах у хаце-чытальні і г. д. падрыхтаваць у адпаведным напрамку думку насельніцтва.

Усё, што ёсьць здаровага ў вёсцы, адгукнецца на пачын «Аўтадору», і вясковая ячэйка зможа практычна прыступіць да адпае з задач «Аўтадору»—папраўкі дарог.

Разам з гэтым трэба ўлічваць, што гэта справа не кампанейская, што гэта справа не аднаго году. Вясковая ячэйка „Аўтадору" павінна быць тым правадніком, праз які селянін пазнаёміцца з спосабамі рамонту дарог, работамі па замашчэньню вуліц і г. д. У плян работ вясковых ячэек павінна ўвайсьці (асабліва ў зімовы пэрыяд) правядзеньне гутарак з сялянамі аб дарожным будаўніцтве, аб аўтамабілізацыі, а дзеля гэтага неабходна, каб кожная ячэйка выпісвала часопіс «Аўтадору»—«За рулём», адкуль шмат можна ўзяць матар'ялаў для аўтадораўскай работы на вёсцы. Вясковыя ячэйкі павінны з'арганізоўваць насельніцтва вёскі, каб, упарадкоўваючы дарогі, сваімі сіламі пакончыць з бездарожжам.

Але перад вясковымі ячэйкамі «Аўтадору» стаіць задача ня толькі будаўніцтва дарог. У нас яшчэ пакуль што многія глядзяць так: «калі гэта казённае, то яго можна псаваць».

Вясковыя ячэйкі «Аўтадору» ў пляны свае працы павінны ўключыць ня толькі пытаньні пабудовы дарог, але і аховы іх, праводзячы адпаведныя гутаркі з сялянамі.

А. Д.

Набывайце білеты 1-й аўталётарэі „Аўтадору"!

Беларускі «Аўтадор» распачаў продаж білетаў 1-й аўта-лётарэі „Аўтадору".

У ліку галоўных выйгрышаў: 21 аўтамабіль, 20 матацыклаў, 600 вэлёсыпэдаў, 200 матораў да лодак, 500 радыёпрыёмнікаў і звыш 2.000 розных іншых выйгрышаў.

Цана білету—50 кап.

Білеты высылаюцца праўленьнем „Аўтадору" БССР, (Менск, Савецкая 82). На перасылку трэба пасылаць 20 кап. марку.

Зацікаўленасьць да лётарэі вялізарная. У працягу некалькіх дзён распрадана каля 25.000 білетаў. Праўленьне «Аўтадору» штодня атрымлівае патрабаваньні на білеты з самых глухіх кутноў Беларусі.

Н. Г.

АБ АСНОВАХ ЗЕМЛЯУПАРАДКАВАНЬНЯ І ЗЕМЛЯКАРЫСТАНЬНЯ.

(ВЫНІКІ АБГАВАРЭНЬНЯ ПРАЭКТУ САЮЗНАГА ЗАКОНУ. ДАКЛАД Т. ПРЫШЧЭПАВА НА ПРЭЗЫДЫУМЕ ЦВК БССР).

Абгаварэньне праэкту «Основных начал землепользования и землеустройства», згодна дырэктывы Прэзыдыуму ЦВК, праводзілася ў акругах. Былі скліканы спэцыяльныя нарады зямельных працаўнікоў, спэцыялістаў; абгаварэньне праводзілася таксама ў раёнах і сельсаветах, і пасьля ўжо сабраныя матар'ялы абгаварваліся ў акруговых выканаўчых камітэтах, заключэньні якіх падаваны ў НКЗем. Апроч таго, гэты праэкт абгаварваўся на нарадзе членаў ЦВК на апошняй сасіі ЦВК.

Па даручэньні Прэзыдыуму ЦВК, Наркамзем надрукаваў гэты праэкт прыблізна ў колькасьці 40.000 экз. і пашырыў іх па ўсёй Беларусі. Такім чынам, асноўны матар'ял для абгаварэньня быў на ўсіх сельсаветах, і зацікаўленае сялянства мела магчымасьць гэты матар'ял абгаварваць.

Нажаль, да гэтага часу мы яшчэ не падагулілі дэтальных вынікаў абгаварэньня. У нас падагулены пакуль што заключэньні акруговых выканаўчых камітэтаў. Гэтыя заключэньні, праўда, грунтуюцца па матар'ялах, якія яны атрымалі з месц. Але нам пажадана было-б мабілізаваць увесь сялянскі матар'ял для таго, каб у нашай лябараторыі яго канчаткова прапрацаваць.

Апроч таго, гэты праэкт абгаварваўся ў Сельска-Гасп. Акадэміі, і мы маем заключэньні ўсіх спэцыялістаў, якія зьвязаны з гэтым пытаньнем. Нарэшце, гэты праэкт абгаварваўся яшчэ на спэцыяльнай нарадзе навуковых працаўнікоў Інстытуту Бел. Культуры.

Даныя аб тым, колькі было сходаў і г. д., мы маем толькі ад 3-х округ —Віцебскай, Магілеўскай і Менскай. У бліжэйшы час мы зьбярэм усе гэтыя даныя і ад іншых округ і тады ўжо можна будзе ўявіць, колькі чалавек прымала ўдзел у абгаварэньні гэтага закону.

Што датычыцца сутнасьці закону, то тут ёсьць асноўная ўстаноўка правесьці цьвёрды і рашучы прынцып нацыяналізацыі зямлі на ўсяму СССР. Ёсьць некаторыя даныя аб тым, што ў некаторых рэспубліках (галоўным чынам, усходн. респ.) былі выпадкі, калі прынцып нацыяналізацыі зямлі парушаўся; у некаторых раёнах Саюзу нават прымянялася купля-продажа зямлі. Такім чынам, парушаўся асноўны прынцып пралетарскай аграрнай рэвалюцыі—нацыяналізацыя зямлі, і таму ў разьвіцьцё Канстытуцыі Саюзу ССР, дзе даручаецца саюзнаму ўраду выдаць асноўныя пачаткі землякарыстаньня і землеўпарадкаваньня, і дзеля таго, каб правесьці рашуча прынцып нацыяналізацыі зямлі, цяпер ёсьць неабходнасьць у выданьні такога закону.

Другая прычына, якая выклікае выданьне закону, заключаецца ў наступным: у зьвязку з тым курсам, які зараз праводзіцца партыяй і савецкай уладай на хутчэйшую рэканструкцыю сельскай гаспадаркі і перабудовы яе ў сацыялістычным напрамку, трэба даць асноўную ўстаноўку як у зямельным праве, так і ў зямельнай палітыцы. Гэтая ўстаноўка прадугледжваецца праэктам.

Але саюзны закон, па нашай думцы і па думцы іншых працаўнікоў, усё-ж такі не павінен парушаць правы саюзных рэспублік, і ў гэтым законе трэба прадугледзіць тыя зямельныя і аграрныя асаблівасьці, якія існуюць у тэй ці іншай рэспубліцы. І гэты асноўны прынцып нам прыходзілася абараняць у Камісіі Саюзнага Савнаркому, дзе былі прадстаўнікі саюзных рэспублік і спэцыялісты па аграрным пытаньні. У першапачатковым праэкце паміж іншым праходзіў прынцып «общинного" землякарыстаньня. Мы наконт гэтага прынцыпу доўга спрачаліся ў Камісіі і дабіліся таго, што прыняты пад увагу асаблівасьці вучасткова - падворнага землякарыстаньня, якія склаліся на Украіне і ў БССР.

У першапачатковым праэкце гэтага закону па першаму артыкулу была заўвага, што права ўласнасьці на зямлю належыць дзяржаве. Мы высунулі ідэю, што права ўласнасьці на зямлю ў саюзных рэспубліках належыць саюзным рэспублікам. Цяпер у гэтым праэкце Камісія Саюзнага СНК прыняла такую рэдакцыю, што права ўласнасьці павінна належаць саюзным рэспублікам, а пасьля таго, як яны ўваходзяць у Саюз Савецкіх Сац. Рэспублік, гэта права належыць Саюзу. Мы не спрачаліся наконт гэтай апошняй рэдакцыі.

Далей праэкт прадугледжвае садзейнічаньне разьвіцьцю і пабудове сац. сельскай гаспадаркі. Так, прадугледжана, што лепшыя землі даюцца бяднейшаму селянству і ў першую чаргу таму сялянству, якое будзе аб'ядноўвацца ў калектыўныя гаспадаркі. Землі бліжэйшыя да сялібаў і землі лепшыя павінны прадстаўляцца гэтым калектывам. На практыцы ў нас гэты прынцып ужо праводзіцца ў жыцьцё. Далей, надаюцца спэцыяльныя льготы па с.-г. падатку; закон прадугледжвае спэцыяльны крэдыт

ЗАКОНЫ І ЗАГАДЫ ЎРАДУ БССР

Пастанова

Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Беларускае ССР

аб аслабаненьні тав. Казюры С. Л. ад абавязкаў упаўнаважанага Народнага Камісарыяту Замежных Спраў Саюзу ССР пры Савеце Народных Камісараў БССР і аб назначэньні тав. Ульянава А. Т. упаўнаважаным Народнага Камісарыяту Замежных Спраў Саюзу ССР пры Савеце Народных Камісараў БССР.

Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту пастанаўляе:

1. Згадзіцца з аслабаненьнем тав. Казюры, Сяргея Лаўрэнавіча ад абавязкаў упаўнаважанага Народнага Камісарыяту Замежных Спраў Саюзу ССР пры Савеце Народных Камісараў БССР.

2. Згадзіцца з назначэньнем тав. Ульянава, Аляксандра Тодаравіча упаўнаважаным Народнага Камісарыяту Замежных Спраў Саюзу ССР пры Савеце Народных Камісараў БССР.

3. Надаць упаўнаважанаму Народнаму Камісарыяту Замежных Спраў Саюзу ССР пры Савеце Народных Камісараў БССР тав. Ульянаву, Аляксандру Тодаравічу права рашаючага голасу ў Савеце Народных Камісараў БССР.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Чарвяков.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Хацкевіч.

27 кастрычніка, 1928 году.
г. Менск

Постановление

Президиума Центрального Исполнительного Комитета Белорусской ССР

об освобождении тов. Козюры С. Л. от обязанностей уполномоченного Народного Комиссариата по Иностранным Делам Союза ССР при Совете Народных Комиссаров БССР и о назначении тов. Ульянова А. Ф. уполномоченным Народного Комиссариата по Иностранным Делам Союза ССР при Совете Народных Комиссаров БССР.

Президиум Центрального Исполнительного Комитета БССР постановляет:

1. Согласиться с освобождением тов. Козюры, Сергея Лавреновича от обязанностей уполномоченного Народного Комиссариата по Иностранным Делам Союза ССР при Совете Народных Комиссаров БССР.

2. Согласиться в назначением тов. Ульянова, Александра Федоровича уполномоченным Народного Комиссариата по Иностранным Делам Союза ССР при Совете Народных Комиссаров БССР.

3. Предоставить уполномоченному Народного Комиссариата по Иностранным Делам Союза ССР при Совете Народных Комиссаров БССР тов. Ульянову, Александру Федоровичу право решающего голоса в Совете Народных Комиссаров БССР.

Председатель Центрального Исполнительного Комитета БССР А. Червяков.

Секретарь Центрального Исполнительного Комитета БССР А. Хацкевич.

27 октября 1928 г.,
г. Минск.

Пастанова

Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савету Народных Камісараў БССР

ПРА ЗЬМЕНУ ПАСТАНОВЫ ЦВК І СНК БССР «ПРА САМААБКЛАДАНЬНЕ НАСЕЛЬНІЦТВА».

Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляюць: увесьці наступныя зьмены ў пастанову „Пра самаабкладаньне насельніцтва" (З. З. БСС 1928 г. № 7, арт. 37 і № 12, арт. 99):

1. Пры вылічэньні сум самаабкладаньня (арт. 10 закону „Пра самаабкладаньне" (З. З. БССР № 9. арт. 10 за 28 г.—арт. 2 да 1 і 3 закону «Пра пашырэньне пастановы ЦВК і СНК БССР «пра самаабкладаньне насельніцтва» на насельніцтва мястечак і на насельніцтва сельскіх саветаў, якія знаходзяцца ў межах гарадоў (З. З. БССР за 1928 г. № 12, арт. 96) прамысловы падатак ня ўлічваецца.

2. Скасаваць увагу да арт. 3 пастановы «Пра самаабкладаньне насельніцтва» (З. З. БССР 1928 г. № 10, арт. 76), увага да пункта 1 арт. II і п. 1 арт. III пра пашырэньне пастановы ЦВК і СНК БССР „Пра самаабкладаньне насельніцтва" на насельніцтва мястечак і на насельніцтва сельскіх саветаў, якія знаходзяцца ў межах гарадоў (З. З. БССР 1928 г. № 12, арт. 96).

3. Запісаць арт. 8 пастановы «Пра самаабкладаньне насельніцтва» ў наступнай рэдакцыі:

«8. Сельскі (мястечковы) савет мае права паменшыць альбо цалкам зьняць налічаныя сумы па самаабкладаньні з пасобных найбольш занятых гаспадарак".

4. Запісаць арт. 9 пастановы «Пра самаабкладаньне насельніцтва» ў наступнай рэдакцыі:

«9. На агульным сходзе павінны быць вырашаны наступныя пытаньні:

а) мэта самаабкладаньня; б) форма самаабкладаньня (грашовая, натуральная, альбо працоўная; в) агульны разьмер самаабкладаньня; г) крайні тэрмін узносаў на самаабкладаньні, прычым гэты тэрмін трэба прыстасоўваць да пляну работ на ажыцьцяўленьне мерапрыемстваў, аднак ён не павінен быць больш за тры месяцы ад дня прыняцьця пастановы аб самаабкладаньні.

Усе вырашаныя пытаньні павінны быць запісаны ў пастанове, прынятай агульным сходам і падпісанай прэзыдыумам сходу.

Да пастановы павінен быць дададзены пратакол, у якім зазначаецца: а) лік грамадзян данага насельніча, маючых выбарчыя правы; б) лік грамадзян, маючых выбарчыя правы, прысутных на агульным сходзе; в) лік грамадзян, якія галасавалі за і супроць пастановы».

5. Чыню ўвагу да арт. 10 скасаваць.

Дадаць да арт. 10 увагу наступнага зьместу:

«Увага. Калектыўныя гаспадаркі і грамадзяне, якія знаходзяцца на дзяржаўнай службе і не ведуць самастойнай гаспадаркі, прыцягваюцца да самаабкладаньня на агульных падставах. Савецкія гаспадаркі, у тым ліку гаспадаркі дзіцячых дамоў, сельска-гаспадарчых школ і д. п., да самаабкладаньня не прыцягваюцца".

6. Запісаць арт. 19 у наступнай рэдакцыі:

«19. Калі пастанова аб задаволеньні скаргі вынесена была пасьля таго, як раскладка набыла сілу, то сума, унесеная грамадзянінам, падаўшым скаргу, альбо спагнаная з яго, павінна быць яму вернута".

7. Дадаць да арт. 20 абзац другі ў наступнай рэдакцыі:

„На нядоімкі па самаабкладаньні налічваецца пеня ў парадку, вызначаным для нядоімак сельска-гаспадарчага падатку".

8. Запісаць п. 2 арт. III закону «Пра пашырэньне пастановы ЦВК і СНК БССР «Пра самаабкладаньне насельніцтва» на насельніцтва мястечак і на насельніцтва сельскіх саветаў, якія знаходзяцца ў межах гарадоў» (З. З. БССР за 1928 г. № 12, арт. 96) у наступнай рэдакцыі:

«Правы і абавязкі па самаабкладаньні, дадзеныя райённым выканаўчым камітэтам, у дачыненьні да сельскіх саветаў, якія знаходзяцца ў межах гораду, пераходзяць да таго выканаўчага камітэту або гарадзкога савету, якому сельскі савет беспасрэдна падпарадкаваны».

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Чарвяков.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР М. Галадзед.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Хацкевіч.

3 лістапада 1928 году
г. Менск.

Постановление

Центрального Исполнительного Комитета и Совета Народных Комиссаров БССР

О ВНЕСЕНИИ ИЗМЕНЕНИЙ В ПОСТАНОВЛЕНИИ ЦИК И СНК БССР „О САМООБЛОЖЕНИИ НАСЕЛЕНИЯ".

Центральный Исполнительный Комитет и Совет Народных Комиссаров БССР постановляют внести следующие изменения в постановления ЦИК и СНК БССР «О самообложении населения» (С. З. БССР 1928 г., № 7, ст. 37 № 12, ст. 96):

1. При исчислении суммы самообложения (ст. 10 закона «О самообложении населения» (С. З. БССР № 9, ст. 10 за 1928 г.) статья 2 к 1-му и 3-му закону «О распространении постановления ЦИК и СНК БССР «О самообложении населения» на население местечек и сельских советов, находящихся в пределах городов" (С. С. БССР 1928 г. № 12, ст. 96) промысловый налог не учитывается.

2. Отменить примечание к статье 3 постановления «О самообложении населения» (С. З. БССР 1928 г., № 10, ст. 76), примечание к пункту 1-му статьи 2-ой и пункту 1-му статьи 3-й о распространении постановления ЦИК и СНК БССР «О самообложении населения» на население местечек и на население сельских советов, находящихся в пределах городов (С. З. БССР 1928 г., № 12, ст. 96).

3. Статью 8-ую постановления «О самообложении населения» изложить в следующей редакции:

«8. Сельский (местечковый) совет имеет право уменьшить или совсем освободить от внесения начисленных на них сумм самообложения отдельные наиболее маломощные хозяйства".

4. Изложить статью 9-ую постановления „О самообложении населения» в следующей редакции:

«9. На общем сходе должны быть разрешены следующие вопросы:

а) цель самообложения, б) форма самообложения (денежная, натуральная или трудовая), в) общий размер самообложения, г) крайний срок взносов по самообложению, причем этот срок должен быть приурочен к плану работ по осуществлению мероприятий, но не может превышать трех месяцев со дня принятия постановления о самообложении. Все разрешенные вопросы должны быть записаны в постановлении, принятом общим сходом и подписанном президиумом схода.

К постановлению схода прилагается протокол, в котором должно быть отмечено: а) число граждан данного населения, имеющих избирательные права, б) число имеющих избирательные права граждан, присутствовавших на сходе, в) число граждан, голосовавших за и против постановления».

5. Ныне действующее примечание к статье 10-й отменить.

Дополнить статью 10-ую примечанием следующего содержания:

«Примечание. Коллективные хозяйства и граждане, состоящие на государственной службе и не ведущие самостоятельного сельского хозяйства, привлекаются к самообложению на общих основаниях. Советские хозяйства, в том числе хозяйства детских домов, сельско-хозяйственных школ и т. п. к самообложению не привлекаются».

6. Изложить статью 19-ую в следующей редакции:

«19. В случае, когда постановление об удовлетворении жалобы состоялось после того, как раскладка вошла в силу, сумма, внесенная лицом, подавшим жалобу, или взысканная с него, подлежит возврату».

7. К статье 20-ой добавить 2-ой абзац в следующей редакции:

«На недоимки по самообложению начисляется пеня в порядке, установленном для недоимок по сельско-хозяйственному налогу».

8. Изложить пункт 2-ой статьи 3-й закона „О распространении постановления ЦИК и СНК БССР «О самообложении населения» на население местечек и на население сельских советов, находящихся в пределах городов" (С. З. БССР 1928 г., № 12, ст. 96) в следующей редакции:

«Права и обязанности по самообложению, данные районным исполнительным комитетам в отношении сельских советов, находящихся в пределах города, переходят к тому исполнительному комитету или городскому совету, коему сельский совет непосредственно подчиняется».

Председатель Центрального Исполнительного Комитета БССР А. Червяков.

Председатель Совета Народных Комиссаров БССР Н. Голодед.

Секретарь Центрального Исполнительного Комитета БССР А. Хацкевич.

3 ноября 1928 г., г. Минск.

КУТОК РАБСЕЛЬКОРА.

Да ведама рабселькораў.

Цэнтральная беларуская арганізацыйная камісія па падрыхтоўцы IV усесаюзнай рабселькораўскай нарады разьмеркавала прызначаныя месцы для Беларусі наступным чынам: Менская округа пасылае 2 рабкораў: 1 юнкора, Віцебская—1 рабкора, Гомельская—1 рабкора і 1 юнкора, Полацкая—1 батраку-рабкора, Магілеўская, Аршанская і Бабруйская—па 1 селькору, Мазырская—1 рабкора насьценгазэт установы і рэдакцыі цэнтральных газэт—«Зьвязда», «Беларуская Вёска» і «Аніцабр»—па 1 прадстаўніку. Усяго, такім чынам, ад Беларусі будзе абрана і пасована 14 прадстаўнікоў.

Працу гуртка трэба ажывіць.

Пры нашай хаце-чытальні, яшчэ зімой існаваў селькораўскі гурток, у якой было каля 10 чалавек селькораў. Спачатку існаваньня гуртка, праца ішла вельмі добра. Сходы гуртка зьбіраліся 2 разы ў месяц. Пры гуртку, супольна з камсамольскай і партыйнай ячэйкамі выпускалася і сьценгазэта. Сяляне вельмі хвалілі газэту тым, што яна выдаецца нашымі вясковымі хлопцамі—актывістамі, якія ўсё ведаюць. Але калі паглядзець цяпер, дык сходаў больш як месяцаў пяць ня-было, і селькоры цяпер, працуюць паасобна. Працу гуртка селькораў, трэба ажывіць. К.

Уваравіцкі р.

ХРОНІКА.

ПРЫВІТАНЬНЕ Ц. ГАРТНАМУ.

У дзень дваццатых угодкаў літаратурна-грамадзкае працы шлём табе шчырае прывітаньне і жадаем адважна стаяць на варце інтарэсаў працоўных.

МОЛАДЗЬ ВІЛЕНСКАЙ БЕЛАРУСКАЙ ГІМНАЗІІ.

Плян забясьпечаньня БССР с.-г. машынамі.

На апошнім пасяджэньні прэзыдыуму Дзяржпляну БССР быў заслуханы даклад аб пляне забясьпечаньня БССР сельска-гасдарчымі машынамі на бягучы 1928-29 год. Дзяржплян БССР намеціў завезьці с.-г. машын для БССР арыентыровачна на 8173719 руб.

З гэтай сумы для патрэб сельскай гаспадаркі маюць быць закуплены глебаапрацоўчых машын на 814.438 руб., пасеўных—на 140.815 руб., уборачных—на 168.790 руб., ачышчальных—на 858.970 р. і г. д. На набыцьцё трактараў мае быць выдана 458.598 руб. і на закупку штучнага ўгнаеньня—1554960 руб. Гэты плян зараз перададзен на канчатковае зацьверджаньне Эканомнарады БССР.

Дарожнае будаўніцтва ў Менскай акрузе на 28-29 г.

Прэзыдыум Менскага АВК зацьвердзіў вытворчы плян дарожнага будаўніцтва на 1928-29 год на агульную суму 395.739 р.

Згодна пляну, будуць здрамантаваны наступныя дарогі ў акрузе: Пухавічы—Чэрвень, Пухавічы—Клінок—Чэрвень, Менск—Слуцак, Менск—Лагойск — Плешчаніцы, Рудзеск—Сьмілавічы, Барысаў—Зембін—Плешчаніцы.

Сельскія дарогі часткова будуць рамонтавацца за сродкі самаабкладаньня.

Дарога Менск—Слуцак будзе рамонтавацца з тым, каб па ёй з 1929-30 году маглі хадзіць аўтабусы.

У Маладняку.

Ц. Бюро Маладняка створана бюро літаратурнае кансультацыі. У склад яго ўваходзяць т. т. М. Аляхновіч, А. Гародня, А. Моркаўка, Р. Мурашка, С. Хурсік і згадзіўся прымаць удзел у працы тав. М. Гарэцкі.

Бюро літаратурнае кансультацыі будзе прасяляць усе творы, якія дасылаюцца ў Маладняк і творы ўсіх паэтаў і пісьменьнікаў, якія пажадаюць атрымаць усебаковую ацэнку таго або іншага твору.

Бюро прыступае да працы.

Курсы па перападрыхтоўцы начскладу запасу.

Цэнтральны Савет ТДА-Авіяхіму БССР арганізуе курсы па перападрыхтоўцы начскладу запасу.

На курсы будуць трымацца ўсе жадаючыя з начскладу запаса пахоты.

Скончыўшыя курсы аслабяняюцца ад перападрыхтоўкі па вайсковай лініі. Курсы будуць працаваць па вечарох у працягу зімовага пэрыяду.

Будзе каапэравана 2000 саматужнікаў.

На падставе пастановы СНК СССР па дакладу тав. Галадзеда, Беларускі Прамысловы Саматужны саюз уваходзіць у саматужны камітэт ВСНГ СССР з зваўкай на новыя цяжкасьці сыравіны. Гэта дасьць магчымасьць каапэраваць каля 2000 саматужнікаў.

Насеньне і штучнае ўгнаеньне для Менскай акругі.

Прэзыдыум Менскага АВК зацьвердзіў плян дастаўкі ў акругу насеньня і штучнага ўгнаеньня на 1928-29 год. Згодна гэтага пляну аўса будзе дастаўлена 1400 тон, суперфасфату—4000 тон, фасфарытнай мукі—2000 тон, калійнай солі—662 тоны, тамасшлаку—1052 тоны і азоцістых соляў—300 тон.

Менскі дзень.

— Усебеларуская нарада акруговых інспэктароў аховы здароў'я адчыняецца сёньня ў памяшканьні Нар Кам. Аховы Здароў'я. На нарадзе будуць заслуханы даклады аб дзяржаўным і мясцовым бюджэтах на ахову здароў'я ў 1928-29 г., аб медыцынскай дапамозе застрахаваным і інш.

— Пленум ЦБ юных піянэраў адчыняецца сёньня ў памяшканьні ЦК ЛКСМБ. На пленуме будзе абгаворана пытаньне аб новай сыстэме работы піянэрскіх арганізацый і аб работе ў школе.

20.000 пуд. алею адпушчана для патрэб шырокага рынку Беларусі да 1 студзеня. Апрача таго, мяркуецца яшчэ дадаткова атрымаць 5.000 п. алею.

— На 155312 руб. экспартаваў заграніцу ў кастрычніку розных лесматар'ялаў Лесбел. Апрача таго Белдзяржгандаль экспартаваў лесу на 79605 р.

— На першы квартал бягучага году вызначана завезьці 550 тон пісчай паперы і 150 тон для друку. Наркамгандаль БССР ставіць пытаньне перад Масквой аб павялічэньні водпускі паперы.

— У 1928-29 годзе распачнецца ў Менску пабудова вялікага цэглянага заводу. Кошт пабудовы заводу вылічаны ў 345000 руб. Гэты завод штогод будзе выпускаць да 6.000.000 шт. цэглы. Апрача таго ў розных раёнах Меншчыны будзе па лініі мясцовай прамысловасьці пабудована 21 смалакурны завод агульным коштам у 96.000 р.

— Цэнтральны Савет Прафсаюзаў Беларусі разьмеркаваў паміж асобнымі саюзамі і округамі 125 месц у санаторыі Сасноўка на зімовы пэрыяд. З агульнай колькасьці Менская округа атрымала 24 месцы.

— Белдзяржгандаль да 1 лістапада загатоўлі сушоных грыбоў 2000 пуд, і марынаваных—900 пуд. Загатоўкі вяліся галоўным чынам, у Гомельскай і Мазырскай округах.

Да гэтага часу экспартавана ў Амэрыку 2 вагоны сушоных грыбоў і 1 вагон марынаваных. Апрача таго экспартавана паўтары вагоны грыбоў ў Італію.

Сярод беларускіх эспэрантыстаў.

Рост ячэек і гурткоў эспэранто.

За апошні час назіраецца ўзмацнёны рост ячэек эспэранто і гурткоў па вывучэньню эспэранто.

Так, за апошні месяц на Менску арганізавана 6 ячэек эспэранто і 13 гурткоў па вывучэньню эспэранто.

Ячэйкі і гурткі арганізаваны пры прадпрыёмствах, установах, клюбах і школах.

Посьпех радыё-курсаў эспэранто.

У кастрычніку м-цы радыё-перадача БССР сумесна з беларускім камітэтам саюзу эспэрантыстаў арганізавалі радыё-курсы на вывучэньню мовы эспэранто. Курсы маюць вялікі посьпех. Так, ужо заявілі аб жаданьні праслухаць па радыё лекцыі на эспэранто 60 чал., у большасьці рабочыя, партыйцы і камсамольцы. Штодзённа прыбываюць новыя анкеты аб залічэньні на гэтыя курсы.

Пераклад твораў беларускіх пісьменьнікаў на эспэранто.

Зараз літаратурная сэкцыя беларускага камітэту саюзу эспэрантыстаў перакладае на эспэранто творы беларускіх пісьменьнікаў. Так, на эспэранто перакладаюцца некаторыя творы Бядулі з зборніку „Дзеягатка».

Таксама перакладаюцца на эспэранто вершы беларускіх народных паэтаў Якуба Коласа і Янкі Купалы.

Новыя кнігі.

Паступілі ў рэдакцыю газэты «Савецкая Беларусь» для рэцэнзіі наступныя кнігі.

1. „Беларуская вэтэрынарыя" № 10. Штомесячная часопісь навуковай, практычнай і прафэсыянальнай вэтэрынарыі. Першы выпуск вэтэрынарных дактароў Беларускага Дзяржаўнага Вэтэрынарнага Інстытуту імя Кастрычнікавай рэвалюцыі. Віцебск. Стар. 48, цана 1 руб.

2. «Вестник иностранной литературы» № 10. Стар. 159, цана 1 руб. Дзяржаўнае Выдавецтва Масква Ленінград.

3. «Бальшавік Беларусі» № 10. Часопісь палітычі і практыкі партыйнай працы орган ЦК КП(б)Б. Выданьне аддзелу друку пры ЦК КП(б)Б.

ЯК ПРАХОДЗІЦЬ КАМПАНІЯ ПА ЗБОРУ ЛОМУ.

У сучасны момант, па дырэктывах ЦКСПС і ЦП саюзаў, створаны на заводах камісіі, якія вядуць працу па выяўленьню лому.

На лініі камсамолу арганізаваны тройкі пры Менскім акругкоме ЛКСМБ і райкомах, а пры ячэйках—упаўнаважаныя. Апошнімі вядзецца праца па правядзеньню месячніка па збору металічнага лому, аб'яўленага ЦК ЛКСМБ.

Нядаўна пры Савеце Сынды катаў адбылася нарада з удзелам прадстаўнікоў запікаўленых арганізацый, дзе быў прынят шэраг рашэньняў па ўзмацненьню збору металічнага і чугуннага лому па БССР.

Гэткая-ж нарада адбылася і пры Нар. Кам. Гандлю БССР.

Шырока разгарнулася кампанія па збору лому па Менску. Штодзённа на склад Рудмэтальгандлю прыбываюць вазы лому.

Добра праходзіць праца па здачы металічнага і чугуннага лому з боку Эльводу, Менсельпрому і вайсковых часьцей. Ажыўленьне таксама прымячаецца па лініі Жакт'аў, у якіх праца па здачы лому да гэтага часу праходзіла ня зусім здавальняюча.

Па папярэдніх падліках па Менску за апошнія 10 дзён, г. зн. з 1-га на 10-га лістапада сабрана каля 3 з паловаю вагонаў металічнага лому.

Па округах кампанія па збору лому распачалося з 9-га лістапада. Па маючыхся вестках, тая кампанія на астатніх гарадох таксама распачала разгортвацца.

Адначасова з месц (Гомель) паступаюць весткі аб адсутнасьці ўказаньняў па ведамсьцьвенных арганізацыях з боку ВСНГБ і Нар. Кам. Гандлю БССР аб збору лому, з прычыны чаго адзначаецца затрымка ў здачы лому. Гэту хібу трэба хутчэй выправіць, бо яна пагражае кампаніі па збору лому.

Што датычыцца вёскі, дык трэба адначыць, што кампанія па збору лому яшчэ зусім не зачапіла яе. Вёска яшчэ не адгукнулася. Трэба як найхутчэй узмацніць кампанію па збору і здачы лому на вёсцы, трэба дабіцца каб тую колькасьць металічнага і чугуннага лому (17000 тон), вызначаную для БССР, сабрацьь.

Кантрактацыя сьвіней праходзіць слаба.

На апошнім пасяджэньні Наркамгандалю БССР быў абгавораны даклад аб ходзе кантрактацыі бэконных сьвіней.

З дакладу відаць, што кантрактацыя сьвіней праходзіць вельмі слаба. Гэткі тэмп кантрактацыі тлумачыцца цэлым шэрагам прычын. Папершае на ходзе кантрактацыі адбіваюцца высокія рынкавыя цэны на хлебныя культуры (на карму), у сувязі з чым на вольным рынку стаяць высокія цэны на сьвініну. Падругое, Белдзяржгандаль далёка недастаткова правёў працу сярод сялянства шляхам распаўсюджваньня адпаведных лістовак, плякатаў і г. д. Не заўсёды Белдзяржгандаль клапаціўся аб бесперабойным атрыманьні па нарадах Наркамгандалю кармоў для забясьпечаньня сялянства, якое кантрактавала сваіх сьвіней.

Недастатковы таксама ўдзел у гэтай вельмі важнай справе і агранамічнага пэрсаналу Наркамзему.

Для паляпшаньня і ўзмацненьня тэмпу кантрактацыі бэконных сьвіней Наркамгандалю вырашыў правесьці шэраг мерапрыемстваў. Для большага заахвочаньня сялянства норма снабжэньня кантрактантаў канцэнтраванымі кармамі павялічваецца з 7 да 10 п. на падсьвінка. Для бядняцкіх гаспадарак будзе ўстаноўлена павялічаная норма водпуску канцэнтраваных кармоў, а для заможнага сялянства—паменшаная.

У мэтах максымальнай папулярызацыі справы кантрактацыі і бэканізацыі сьвіней Белдзяржгандалю запрапанавана тэрмінова выдаць і распаўсюдзіць сярод сялянства адпаведныя лістоўкі, брашуры і плякаты.

Кантрактацыя сьвіней будзе праходзіць дрэнна і ў далейшым, калі ў бліжэйшым часе на месцах ня будуць прыняты эфэктыўныя меры да ўзмацненьня гэтай працы. А палепшыць гэту справу неабходна, бо ў аршанскі бэконны завод, які будзе скончаны ў 1929 г., патрабуецца штогод да 75000 сьвіней.

Акруговым выканаўчым камітэтам неабходна даць дырэктывы райвыканкомам і, асабліва агранамічнаму пэрсаналу Наркамзему і сельска-гаспадарчай каапэрацыі, аб прыняцьці больш жывога ўдзелу ў правядзеньні кантрактацыі. Трэба дабіцца большай інфармацыі насельніцтва праз акруговыя газэты, сельсаветы, хаты-чытальні і іншыя мясцовыя арганізацыі аб карысьці кантрактацыі. Трэба таксама заслухоўваць даклады на пасяджэньнях акрвыканкомаў мясцовых органаў Белдзяржгандалю і сельска-гаспадарчай каапэрацыі і, у патрэбных выпадках, рабіць належныя захады для паляпшаньня працы па кантрактацыі.

„Бюро папсуцьцяў".

Аднойчы, разглядаўшыся на паштова-тэлеграфную кантору за яе «кнігу тэлефонных абанэмэнтаў», мы хацелі напісаць на яе фэльетон. Але падышоў адзін упаўнаважаны супрацоўнік газэты і кажа:

— Кінь, брат, пісаць! Пачакай. Паштова-тэлеграфная кантора складае новую кнігу тэлефонных абанэмэнтаў. Там ужо будзе ўсё ў парадку.

Я, як сумленны працаўнік рэдакцыі, пераверыў. Мо', думаю, і сапраўды ў новай кнізе ўсё будзе ў парадку.

Выпадкі, якія часта пачалі здарацца з сэкратаром нашае рэдакцыі, змусілі мяне прыглядзецца да абанэмэнтнае кнігі бліжэй.

У часе нагляданьняў я быў сьведкаю наступных «гутарак» па тэлефону:

— Дайце, калі ласка, 4... Так, так, № 4.

Тав. Хацкевіч! Гэта гаворыць з рэдакцыі газэты «Савецкая Беларусь». Я наконт чарговага нумару „Саветы Беларусі"... Што?... гэта ня т. Хацкевіч? Штаб дывізіі? Палажэце, калі ласка, трубку!

Сэкратар кладзе трубку і сьпіхоўвае, адвярнуўшыся ў кут.

У другой установе быў такі выпадак:

— Будзьце ласкавы 448. Правільна-448.

Гэта пракуратура?.. Што-о-о-о? Асенізацыйны абоз? Палажэце трубку!

Чалавек, які хацеў выклікаць пракуратуру, грузна апусьціўся ў крэсла. Замест таго, каб сьпешна заявіць пошта ў пракуратуру, чалавек страціў надзею выклікаць яе тэлефон.

Такіх выпадкаў бывае ў Менску шмат. Хочаш выклікаць дырэктара Харчовага Трэсту, а цэнтральная тэлефонная станцыя злучыць цябе з кватэраю якога-небудзь доктара. Адтуль, тоненькім галаском, пілігор заўчае, што «папы дома нет».

* * *

Мы шмат пісалі аб беларусізацыі пошты. Калі мая памяць ня манліва, дык я недзе ў паштовай справаздачы чытаў, што паштовы апарат беларусізаваўся на 103 проц. Аказалася ня прачытаньні тэй-жа кнігі абанэмэнтаў, што пошта яшчэ не пачала беларусізавацца.

Вось прыклады:

„ВЫМАЎ ясна і АДЧОТЛІВА неабходны нумар. Аб ПАПСУЦЬЦІ тэлефону звяніў у БЮРО ПАПСУЦЬЦЯЎ. Калі абанэнт вінаваты ў неправільным ДЗЕЙСТВЕ свайго тэлефону.

... І пры ім заказаў ад АСАБІСТЫХ заказчыкаў... Вінаватыя ў ПАПСУЦЬЦІ тэлефонных пабудоў ПРЫТЯГВАЮЦЦА да судовай адказнасьці... Адносна камутатарных установак у ВЛАСНЫМ АБСЛУГОЎВАНЬНІ.

І так без канца. Якіх толькі варыянцый у гэтай кнізе няма? Проста выходзіць, што пошта гэта ня пошта, а «бюро папсуцьцяў» беларускае мовы. І яшчэ выходзіць, што за гэтыя «дзействы» пошту трэба «прытягнуть» да адказнасьці.

Сёма.

БІБЛІАГРАФІЯ

І. М. Серада. Вэтэрынарыя і Зоогігіена.

Кніжка першая і другая.

Кніжка першая [вымяшчае ў сабе пераважна матар'ял біялёгічнага характару. Гэты матар'ял, зразумела, неабходны для таго, каб высьветліць прычыну хвароб. Толькі трэба адзначыць, што аўтар падае гэтага біялёгічнага матар'ялу ня так многа і пададзены матар'ял выкладзен у яго досыць сьцісла. Асабліва гэтая сьціслась выяўляецца там, дзе аўтар тлумачыць перадачу розных хвароб у спадчыну. Гэтае пытаньне ў біялёгіі зьяўляецца самым цяжкім для ўразуменьня і таму яго патрэбна тлумачыць заўсёды ў папулярнай форме. Таксама ня зусім ясна і тое месца, дзе аўтар высьвятляе пазлектрызаванасьць каморкі арганізму. Аўтар кажа, што кожная каморка арганізму мае пэўны электрычны зарад. Трэба думаць, што гэты электрычны зарад для каморкі зьяўляецца канстытуцыйным, але адкуль зьяўляецца ліпак электрычнасьці ў арганізьме, гэта ня ясна. Гэтую няясьнасьць студэнт 3 і 4 курсаў высьветліць, але для радавога чытача гэтае пытаньне так і застанецца загадкай, а кніга-ж прадназначаецца ня толькі для студэнтаў, але і для сельскіх гаспадароў. Добра зроблена тое, што аўтар увесь біялёгічны матар'ял каморкі будзе по на інфузорыі, як гэта робіцца амаль што ўва ўсіх падручніках, а на каморцы дамашнае жывёліны, дзякуючы гэтаму кніжка набывае вялікую цікавасьць. Досыць добра высьветлены працесы страваваньня каморкі і розныя фактары, што ўплываюць на рост і абмен каморкі.

Кніжка другая вымяшчае ў сабе выключна матар'ял вэтэрынарны. Тут аўтар спачатку разьбірае агульныя заразьлівыя хваробы, напрыклад, сібірскую язву, сухоты, шаленства, кароту, чуму і інш. Апісваючы ход гэтых хвароб, аўтар падрабязна знаёміць чытача з узбудзіцелямі гэтых хвароб, а таксама радзіць, якім спосабам усьцерагчыся ад гэтых хвароб. Добра распрацаваны аддзел аб гістох. У гэтым аддзеле толькі трохі браку малюнкаў. Але найлепш за ўсё распрацаваны незразьлівыя хваробы кароў, коняй і сьвіней. Апісаньне гэтых хвароб ілюструецца высакачэльнай колькасьцю малюнкаў. Хоць гэтыя малюнкі зроблены тут і ня зусім удала, але ўсё-ж даюць поўнае ўяўленьне аб асобных і прыкметах тае ці іншае хваробы. Апісваючы хваробы і лічэньне коняй аўтар шмат месца адводзіць таму, каб высьветліць, што лічэньне жывёлы не зьяўляецца простай рэччу, а надзвычай, гэта ня справа вымагае значнай папярэдняй падрыхтоўкі. Апісваючы дажарнасьць кароў і працэс нараджэньня, аўтар высьвятляе ўсе віды, пры якіх плод застрае ў арганізме маці. Тут даецца цэлы шэраг практычных парад, як дапамагчы ў такіх выпадках жывёле. Гэта, бадай што, будзе самае цікавае для сялянина і малюнкаў тут досыць, ды і зроблены яны ў гэтым месцы нядрэна, так-што ў чытача атрымліваецца поўнае і правільнае ўяўленьне аб тым ці іншым працэсе. У канцы другое кніжкі аўтар даўе сьпіс рэчаў і прэпаратаў, якія неабходна мець у дамашняй аптэчцы і вызначае дозы, якія патрэбна даваць жывёліне ў выпадку тае ці іншае хваробы.

Адносна мовы, трэба адзначыць, што мова ў кніжках досыць добрая, толькі сустракаецца часам вяпытрыманасьць, напрыклад, у адным месцы аўтар ужывае слова сухоты, а ў другім—тубэркулёз і г. д. У заключэньне трэба адзначыць, што абедзьве кніжкі зьяўляюцца каштоўным укладам у нашую сельска-гаспадарчую літаратуру.

С.

НА ПРАВІЛЬНЫМ ШЛЯХУ.

Да пастановак калектыву „Наш тэатр").

Ужо будзе з паўгода, як на старонках нашае газэты час ад часу пачалі зьяўляцца пасобныя нататкі аб дзейнасьці тэатральнага калектыву „Наш тэатр". Зараз калектыў ня толькі аформіўся, ня толькі выбраў сабе пэўны напрамак у сваёй працы, але значна вырас, акраяў. Пачаўшы з аматарскіх пастановак, без належнай падрыхтоўкі і кіраўніцтва, за апошнія месяцы калектыў падрыхтаваў некалькі высокамастацкіх пастановак з глыбокім сацыяльным зьместам, як «Босыя на вогнішчы»—М. Чарота, „На стыку»—Жылуновіча, „Гірд з ваўчынага логу» латвійскага пісьменьніка Райніса і інш.

Калектыў зараз працуе пад рэжысурай артыста БДТІ т. Ждановіча, які шмат у чым дапамог малазому калектыву. Малодыя артысты з захапленьнем і з вялікай настойлівасьцю, бяз жаднай дапамогі з боку, аддаюць увесь свой час сцэне. Каштоўнасьць гэтага калектыву заключаецца яшчэ ў тым, што ў складзе яго знаходзяцца маляры, якія самі малююць дэкарацыі, самі артысты майструюць макеты, шыюць вопратку і, наогул, самі выконваюць усё тое, што датычыць пастановак і мастацкага іх афармленьня.

Зараз калектыў ладзіць пастаноўкі па рабочых клюбах, чырвонаармейскіх часьцях і ўсюды карыстаецца посьпехам.

Трэба адзначыць, што „Наш тэатр" адразу ўзяў правільны напрамак. У яго рэпэртуары няма тэй лубачнасьці і тэй вульгарнай спрошчанасьці, якую можна часта заўважыць у пастаноўках «для народу». Як мы адзначалі вышэй, рэпэртуар калектыву падабраны даволі ўмела, дзе мастацкая вартасьць адпавядае злучана з сацыяльна-пазнавымі праблемамі.

Нам давялося прысутнічаць на рэпэтыцыях пастановак „Гірд з ваўчынага логу", «Босыя на вогнішчы» і інш. Даволі выразна паказана ў „Гірдзе» ігра рэвалюцыянэра-ляспьніка, які забівае свайго 12-цігадоўга сына за тое, што апошні выдаў палічыць члена партыі, за якім даўно сачыла паліцыя. Выканала добра сваю ролю хозяка ляспьніка, якая дала тым абмежаванай мяшчанкі.

Вельмі цікавым зьяўляецца трактоўка «Босыя на вогнішчы». Да гэтага часу шмат больш вопытным у акторскім выкананьні сілы ня браліся за гэтую рэч. Зараз-жа, дзякуючы калектыўнай дакладнасьці, гледач можа ня толькі ўбачыць, але глыбока адчуць клясавую барацьбу на Беларусі ў першыя гады рэвалюцыі.

Трэба сказаць, што гэты калектыў надае надзеі, нажаль да гэтага часу яму адводзілася мала ўвагі. Тым часам, у сучасны момант, калі пытаньню культурнай рэвалюцыі і культурнаму паходу ў вёску надаецца вялікае значэньне, мы проста недаацэньваем значэньне яго ролі.

Ц. І.

Апавяшчэньні.

ДОМ АСЬВЕТЫ.

Сёньня, а 8 гадз. увеч. лекцыя Канапліна для юнюсных. Пасьля лекцыі кіно. У пятніцу лекцыя Корсіні „Увесь сьвет" з дыапозытывамі.

Цэны ад 10 да 25 к. Пач. а 8 г. уве